Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

СТУДЗЕНЬ 9 1934 г. АЎТОРАК № 7 (4840) Год выдання XVII

Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — БЫЦЬ УВАСАБЛЕННЕМ ДЫСЦЫПЛІНЫ І АРГАНІЗАВАНАСЦІ.

ПРЫВІТАННЕ ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТЫЙНАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ТАВ СТАЛІНУ.

ВЫСТУПЛЕННЕ ТАВ. ГІКАЛО НА БАРЫСАЎСКАЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ.

ДЗЕНІСКЕВІЧ — ЗАДАЧЫ ПАДРЫХТОЎКІ І ВЫЛУЧЭННЯ КАДРАЎ. **КУДЗІНАЎ** — КІРАВАЦЬ КАНКРЭТНА І АПЕРАЦЫЙНА.

ТАВ. **ТРАЯНОЎСКІ** ПРЫБЫЎ У ВАШЫНГТОН. ЗАЯВА ТАВ. ТРАЯНОЎСКАГА ПА РАДЫЁ.

ЗА МЯЖОЙ:

СКАНДАЛЬНАЯ ФІНАНСАВАЯ АФЕРА ВА ФРАНЦЫІ.

МІНІСТР БЕК АБ ПОЛЬСКА-СОВЕЦКІХ АДНОСІНАХ.

Пад знакам яшчэ большага згуртавання радоў КП(б)Б вакол ленінскага ЦК ВКП(б) і правадыра партыі тав. СТАЛІНА, пад знакам павышэння актыўнасці і рэволюцыйнай пільнасці праходзяць партканферэнцыі

БЫЦЬ УВАСАБЛЕННЕМ ДЫСЦЫПЛІНЫ І АРГАНІЗАВАНАСЦІ

Тэзісы к XVII з'езду па арганізацыйных пытаннях (партыйнае і совецкае будаўніцтва) узнімаюць на новую вышэйшую пытанне аб кіруючай ролі партыі ў сістэме дыктатуры пролетарыята, у соцыялістычным будаўніцтве, аб ролі кожнага комуніста, як актыўнага, перадавога барацьбіта за справу соцыялізма.

Ворагі партыі — трацкісты і правыя апартуністы — заўсёды прабавалі падарваць гэту кіруючую ролю партыі. Быў час, калі трацкісты, напрыклад, адным з аргументаў у сваёй барацьбе супроць партыі высоўвалі пошлае, паплепніцкае цверджэнне, што нібыта партыйныя арганізацыі «некампетэнтны», не разбіраюцца ў гаспадарчых пытаннях і дарэмна ўмешваюцца ў гаспадарчыя справы краіны.

Правыя апартуністы ў сваёй барацьбе супроць партыі, між іншым, рабілі стаўку на тое, каб абасобіць, адарваць дзяржаўны апарат ад партыі, аспабіць партыйнае кіраўніцтва. Правыя апартуністы ў прафсаюзах, паўтараючы меншавіцкія зады, марылі зрабіць прафсаюзы «незалежнымі» ад партыі.

Партыя пад кіраўніцтвам т. СТАЛІНА ўшчэнт разграміла трацкістаў і правых. Жалкімі, смехатворнымі аказаліся зараз гэтыя іх спробы. За апошнія 10-гадзіе гігантаў вырасла значэнне партыі, як кіруючай і накіроўваючай сілы ў сістэме дыктатуры пролетарыята.

Стройная сістэма мерапрыемстваў, праведзеная Цэнтральным Камітэтам за перыяд паміж XVI і XVII з'ездамі ў галіне арганізацыйнай перабудовы ўсіх органаў і апаратаў пролетарскай дыктатуры прыспасобіла да новых задач рэканструкцыйнага перыяда, атрымлівае свае завяршэнне і тэарэтычнае абагульненне ў тэзісах па дакладу т. КАГАНОВІЧА.

Сюды адносяцца такія важнейшыя крокі, як стварэнне рэйкаў, арганізацыя палітаддзелаў МТС і саўгасаў, арганізацыя і разгубуйненне абласцей, разгубуйненне наркаматаў і прафсаюзаў, барацьба з канцылярска-бюракратычнымі метадамі кіраўніцтва, абязлічкай і функцыяналкай у вугольнай прамысловасці, на чыгуначным транспарце, чыстка совецкага апарата і, нарэшце, разгортванне чысткі партыі, як вышэйшай формы партыйнай самакрытыкі. Усе гэтыя мерапрыемствы яшчэ больш павысілі магутнасць пролетарскай дыктатуры, падняві значэнне партыі, як арганізаванага авангарда соцыялістычнага будаўніцтва.

На новай ступені нашай сусветна-гістарычнай барацьбы, у перыяд 17-га з'езда, партыя зноў і зноў вывярае ўвесь механізм дыктатуры пролетарыята, каб да канца перамагчы адставанне арганізацыйна-практычнай работы ад патрабаванняў палітычнай лініі партыі.

Партыя пад'яўляе яшчэ больш высокія патрабаванні да кожнага свайго члена. Быць увасабленнем дысцыпліны і арганізаванасці — вось што патрабуецца зараз ад кожнага партыйца, каб з гонарам выканаць свае абавязкі барацьбіта, які ідзе ў авангардзе соцыялістычнага будаўніцтва, каб умець весці за сабой і, падымаць беспартыйных рабочых і калгаснікаў да ўзроўня перадавога атрада.

Не выпадкова тэзісы ўстанаўляюць павышэнне ліку рэкамендацый і павышэнне партыйнага стажа рэкамендацый, пракіруючых «прымаць у партыю толькі актывістаў, праявіўшых сябе на рабоце».

Павышаючы яшчэ больш патрабаванні да кожнага партыйца, да кожнага наваступаючага таварыша, партыя выконвае вядомае ўказанне Леніна, дадае ім яшчэ на другім з'ездзе: «Мы павінны стараніцца падняць годнасць і значэнне члена партыі вышэй, вышэй і вышэй». Адначасова тэзісы к XVII з'езду ўстанаўліваюць новую форму згуртавання вакол ВКП(б) найбольш блізкіх да партыі беспартыйных актывістаў—стварэнне груп спачуваючых пры нізавых партыйных арганізацыях. У гэтыя групы павінны прымацца таварышы, паказаўшыя на справе, на вытворчасці, у калгасе сваю актыўную дапамогу партыі, але яшчэ недастаткова падрыхтаваныя да ўступлення ў партыю. Праз гэтыя групы партыя будзе яшчэ больш мацаваць сваю сувязь з масамі.

Тэзісы па-новаму ставяць пытанне аб первічнай партыйнай арганізацыі. Да апошняга часу нізавой партыйнай арганізацыяй з'яўлялася ячэйка. Сама назва гэта захавалася яшчэ з падпольных часоў, калі сетка партыйных арганізацый складалася з невялічкіх клетачак — ячэек, налічваўшых нават на буйным прадпрыемстве, прыкладна, 10-15 чалавек. А цяпер нарэшце партыйная арганізацыя завода налічвае 1.000—1.500—2.000 членаў і кандыдатаў партыі. Паняцце «ячэйка» не адпавядае зараз такой арганізацыі, якую мы маем на заводзе, не адпавядае таму аб'ёму задач, якія гэта арганізацыя заклікана вырашаць.

«Лічачы, што партыйныя ячэйкі ў сучасны момант як па складу, так і па сваіх задачах і фактычнай рабоце перарасці рамкі ячэек старога тыпа, з'езд пастанаўляе перафармаваць існуючыя партыйныя ячэйкі ў заводскія, транспартныя, чырвонаармейскія, калгасныя, вузаўскія, установуўскія і іншыя партыйныя арганізацыі з партыйным камітэтам на чале», — указваецца ў тэзісах па арганізацыйных пытаннях.

На XI з'ездзе партыі Ленін вобразна гаварыў, што комуністычная партыя ў народнай масе з'яўляецца «капляй у моры». Мы перамаглі найвялікшыя труднасці, якія меў на ўвазе тады Ленін, труднасці, якія выцякалі з пераважання ў нашай краіне дробна-таварнай сялянскай гаспадаркі. На базе індустрыялізацыі і калектывізацыі, на базе разгорнутага соцыялістычнага наступлення на капіталістычныя элементы партыя змяніла твар краіны. Ідэі будаўніцтва соцыялізма праніклі ў свядомасць дзесяткаў мільёнаў. За 10 год пасля смерці Леніна наша партыя вырасла колькасна і якасна. У вялізарнай ступені вырас аўтарытэт партыі Леніна—Сталіна ў самых шырокіх народных масах.

І менена таму, што нязмерна павысіўся аўтарытэт нашай партыі ў самай глыбокай гушчы народных мас, зараз больш чым калі-небудзь мае значэнне не столькі колькасць, колькі якасць комуністаў, уменне кожнага комуніста нястомна працаваць над сабой, над павышэннем сваёй палітычнай і тэхнічнай падрыхтоўкі, сваёй арганізаванасці і дысцыплінаванасці, уменне комуністаў падымаць кожнага рабочага і калгасніка да ўзроўня актыўных і свядомых будаўнікоў соцыялістычнага грамадства.

Важнейшым паказальнікам роста комуністычнай культуры, развіцця ўнутрыпартыйнай дэмакратыі з'яўляецца рост новых партыйных кадраў на ўсіх участках нашага будаўніцтва, рост новых кадраў партыйных арганізатараў на заводах, у калгасах, у раённых камітэтах партыі. За апошнія 10 год партыя атрымала каштоўнейшыя папаўненні, якія ў значнай сваёй частцы падняліся ўжо да кіруючай, палітычнай і гаспадарчай работы.

Назавем, напрыклад, т. Кір'янаву, санатара Фрунзенскага райкома партыі (Іванава). Яшчэ нядаўна 10 год назад, уступаючы ў партыю пасля смерці Леніна, яна была элементарна непісьменная, а зараз яна падняпася да ўзроўня моцнага палітычнага кіраўніка, незаўраднага арганізатара. Такіх і яшчэ больш яркіх прыкладаў роста партыйцаў можна было-б указаць многія, многія тысячы.

Тэзісы ставяць па-новаму пытанне аб арганізацыйнай пабудове кіруючых парторганаў цэнтра, вобласці, раёна, уносяць буйнейшыя змены ў існуючую сістэму, аснованыя на вопыце апошніх год.

Замест функцыянальных аддзелаў у абкомах, крайкомах і ЦК ВКП(б) стараюцца па прыкладу сельгасаддзела ЦК цэласныя вытворча-гапінныя аддзелы, якія канцэнтруюць усю работу ў цэлым па данай галіне, усе яе асобныя функцыі: арганізацыйна-партыйную работу, размеркаванне і падрыхтоўку кадраў, агітмасработу, вытворчую прапаганду, нагляд за выкананнем партыйных рашэнняў адпаведнымі совецка-гаспадарчымі органамі і партыйнымі арганізацыямі.

У корані перабудоўваецца работа райкомаў з набліжэннем іх да вытворчых задач пад пунктам гледжання ўзмацнення канкрэтнага кіраўніцтва райкомаў тэрытарыяльнымі партыйнымі арганізацыямі і сельсоветамі і сумесна з палітаддзеламі—калгаснымі арганізацыямі рэбра ў цэлым.

У райкомах і гаркомах (за выключэннем гаркомаў і райкомаў буйнейшых гарадоў) ліквідуюцца ўсе аддзелы. Узамен іх стараюцца кадры разнёсных адказных інструктараў, членаў райкомаў і гаркомаў, якія прымацоўваюцца кожны да пэўнай групы первічных арганізацый, дзе яны абавязаны арганізаваць усе галіны партыйнай работы. Спалучэнне двух асноўных прынцыпаў у стэме партыйнага кіраўніцтва — вытворча-гапіннага і вытворча-тэрытарыяльнага, — стварае новую, яшчэ больш высокую якасць партыйнага кіраўніцтва, яшчэ больш павысіць яго канкрэтнасць і аператыўнасць.

Умацаванне і перабудова ўсёй сістэмы партыйнага кіраўніцтва, намечаныя ў тэзісах, забяспечваюць да пейшае рашучае палепшэнне работы дзяржаўнага і гаспадарчага апарата.

Ліквідацыя функцыяналкі, канкрэтнае кіраўніцтва, цэлае адказнасцю і асобістая адказнасць кіраўніка, найстрожайшая праверка выканання, перасоўка кадраў на вытворчасць, узмацненне партыйнага і совецкага кантролю — тэзісы важнейшыя звенні арганізацыйнай перабудовы і палепшэння работы ўсіх органаў пролетарскай дыктатуры.

Тэзісы па дакладу т. Кагановіча, як і па дакладу тт. Молатава і Куйбышава, знайшлі самы жывы водгук і адзінадушнае ўхваленне ў партыйных арганізацыях, сярод беспартыйных ударнікаў на заводах і фабрыках і ў калгасах. Гэтыя тэзісы пазбаўляюць масы на барацьбу за далейшае палепшэнне дзяржаўнага і гаспадарчага апарата.

— Асабліва запамінаюцца пункты, дзе гаворыцца аб адказнасці, аб адказнасці кожнага работніка за даручаную справу. Я многа раз каглядаў да чаго прыводзіць слабая адказнасць за даручаную справу. Тэзісы к дакладу тав. Кагановіча ў корані памяюць гэту безадказнасць, канцылярска-бюракратычныя метады кіраўніцтва і работы,—гаворыць, напрыклад, тав. Драгілеў М. Г.—беспартыйны рабочы-ўдарнік 5-га скурзавода (Растоў).

—Галоўнай думкай тэзісаў дакладу т. Кагановіча, на мой погляд, з'яўляецца стварэнне такой арганізацыйнай сістэмы работы нашай партыі, пры якой адразу-ж выявіліся-б, як пры святле моцнага пражэктара, нядбальныя, няўмелыя, не ведаючыя сваёй справы кіраўнікі, якія хаваюцца яшчэ і зараз за «капітальнасцю», «важнасцю» і іншай засядальніцкай мітусней. Адным словам, тэзісы Дакладу т. Кагановіча проста ў поб ставяць перад кожным кіраўніком знізу да верху задачу дэтальнага авалдання тэхнікай сваёй справы. А гэта, ясна, палепшыць і якасць кіраўніцтва і работу ўсіх органаў краіны, — гаворыць парторг брыгады т. Швелеў (Ростсельмаш).

Завяршэнне арганізацыйнай перабудовы, якая выцякае з сутнасці разгорнутага соцыялістычнага наступлення, яшчэ больш умацуе дыктатуру пролетарыята. Яно дае ключ і да вырашэння ўсіх задач Другой пяцігодкі, небывалага ўздыму комуністычнай культуры, яшчэ больш павышае адказнасць кожнага комуніста.

У гэтым вялізарнае прынцыповае і практычнае значэнне тэзісаў па арганізацыйных пытаннях. (Парадавы артыкул «ПРАВДЫ»).

На райпартканферэнцыях

ЦК ВКП(б)— тав. СТАЛІНУ

БОЛЬШЭВІКІ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ З ТРЫБУНЫ СВАЁЙ ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ ШЛЮЦЬ ТАБЕ, ЛЮБІМАМУ ПРАВАДЫРУ ПАРТЫІ І ПРАЦОЎНЫХ УСЯГО СВЕТА, ГАРАЧАЕ БОЛЬШЭВІЦКАЕ ПРЫВІТАННЕ.

ДАРАГІ ТАВ. СТАЛІНІ ДА СВАЁЙ ТРЭЦЯЙ ГАРАДСКОЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ МЫ ПРЫХОДЗІМ З ВЯЛІЗАРНЫМІ ПЕРАМОГАМІ. ЗА ТРЫ АПОШНІЯ ГАДЫ У ПРАМЫСЛОВАСЦЬ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ ЎКЛАДЗЕНА 43 МІЛЬЁНЫ РУБЛЁЎ. СТВОРАНЫ БУЙНЫЯ ЗАВОДЫ, РАД НОВЫХ ГАЛІН ПРАМЫСЛОВАСЦІ. ВАЛАВАЯ ПРАДУКЦЫЯ З 1 МЛН. 700 ТЫС. РУБ. У 1913 ГОДЗЕ ВЫРАСЛА ДА 130 МЛН. У 1933 ГОДЗЕ. ВЫРАС РАБОЧЫ КЛАС, ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ГОРАДА ЗА ЧАТЫРЫ ГАДЫ НА 30 ТЫСЯЧ ЧАЛАВЕК. 26 ТЫСЯЧ ДЗЯЦЕЙ РАБОЧЫХ І КАЛГАСНІКАЎ, З ЯКІХ 63 ПРОЦ. ДЗЯЦЕЙ БЕЛАРУСАЎ, НАВУЧАЕЦЦА Ў ШКОЛАХ, КАЛЯ 5 ТЫСЯЧ ПРОЛЕТАРСКІХ ЮНАКОЎ І ДЗЯЎЧАТ НАВУЧАЕЦЦА Ў ВНУ, ВТНУ, РАБФАКАХ, ТЭХНІКУМАХ, РЫХТУЮЧЫСЯ ДА ВЯЛІКАЙ КУЛЬТУРНАЙ ТВОРЧАЙ РАБОТЫ.

НЯМАЛА НАША ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ ПАПРАЦАВАЛА І НАД АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕМ ТВАЙГО ЎКАЗАННЯ АБ СІСТЭМАТЫЧНЫХ КЛОПАТАХ І ПАЛЯПШЭННІ МАТЭРЫЯЛЬНА-БЫТАВОГА СТАНОВІШЧА РАБОЧЫХ. НАМІ ЗА АПОШНІЯ ДВА ГАДЫ СТВОРАНА 15 БУЙНЫХ І 31 ДРОБНЫЯ ПРЫГАРАДНЫЯ ГАСПАДАРКІ. З ГОДА Ў ГОД ПАШЫРАЕЦЦА ПАСЕЎНАЯ ПЛОЩЧА, ПАВЯЛІЧВАЕЦЦА ЎЗБРОЕНАСЦЬ ТРАКТАРАМІ І СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫМІ МАШЫНАМІ.

У БАРАЦЬБЕ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ТВАЙГО ЎКАЗАННЯ МЫ ЦВЁРДА СТАЛІ НА ШЛЯХ ПЕРАТВАРЭННЯ НАШЫХ КАЛГАСАЎ У БОЛЬШЭВІЦКІЯ І КАЛГАСНІКАЎ У ЗАМОЖНЫХ. У РЭЗУЛЬТАЦЕ ГЭТАЙ ВЯСНЫ І ЛЕТА РАД КАЛГАСАЎ НАШАГА РАЁНА ЎЖО МОЦ НА СТАЛІ НА НОГІ, ІДУЦЬ ПРЫ ДАПАМОЗЕ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ І ПАЛІТАДДЗЕЛА МТС НАПЕРАД, ПЕРАМОЖНЫМ МАРШАМ ДА ЗАМОЖНАГА ЖЫЦЦЯ.

УСЕ ГЭТЫЯ ЛІЧБЫ І ФАКТЫ ЎШЧЭНТ РАЗБІВАЮЦЬ МАЛАВЕРАЎ І НЫЦІКАЎ І ДАКАЗВАЮЦЬ ПРАВІЛЬНАСЦЬ І ПЕРАМОГУ НОВЫХ, УКАЗАНЫХ ТАБОЙ МЕТАДАЎ КІРАЎНІЦТВА. ЯНЫ СВЕДЧАЦЬ АБ ВЯЛІКАЙ СІЛЕ ЛЕНІНСКАГА ВУЧЭННЯ, АБ ПЕРАМОЗЕ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, АБ ПРАВАЦЕ ТОЙ РАШУЧАЙ БАРАЦЬБЫ, ЯКУЮ ВЯЛА ПАРТЫЯ ПАД ТВАІМ КІРАЎНІЦТВАМ З ПРАВЫМІ І «ЛЕВЫМІ» АПАРТУНІСТАМІ, З КОНТР-РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ ТРАЦКІЗМАМ І КЛАСАВА-ВАРОЖЫМІ ЭЛЕМЕНТАМІ.

НАШ РОСТ І ПЕРАМОГІ — СВЕДЧЫ ТАГО, ШТО ТОЛЬКІ ВА ЎМОВАХ ПРОЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ МАГЧЫМЫ РОСТ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ АКРАІН, МАГЧЫМА ПЫРОКАЕ ЎЦЯГНЕННЕ РАНЕЙ АДСТАЛЫХ НАРОДАЎ У ГРАМАДСКАЕ, ГАСПАДАРЧАЕ І КУЛЬТУРНАЕ ЖЫЦЦЁ.

ГЭТЫЯ ПЕРАМОГІ БЫЛІ МАГЧЫМЫ ТАМУ, ШТО НА ЧАЛЕ КІРАЎНІЦТВА ВЕЛІЗАРНЫМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВАМ ЗНАХОДЗІЦЦА ВЯЛІКАЯ КОМУНІСТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ, СТВОРАНАЯ ГЕНІЯЛЬНЫМ РЭВОЛЮЦЫЙНЫМ СТРАТЭГАМ І МАЙСТРАМ НАШАЙ ЭПОХІ—ВЛАДЗІМІРАМ ІЛЬЧОМ ЛЕНІНЫМ, І ДЗЯКУЮЧЫ ТАМУ, ШТО ТЫ, ЯГО ЛЮБІМЕЙШЫ ПРАДАЎЖАЛЬНІК, ВЯДЗЕШ ПРОЛЕТАРЫЯТ КРАІНЫ СОВЕТАЎ АД ПЕРАМОГІ ДА ПЕРАМОГІ.

ПРОЙДЗЕН ВЯЛІКІ ШЛЯХ І ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ НАПЕРАДЗЕ. БОЛЬШЭВІКІ НЕ ЗАДАВАЛЬНЯЮЦЦА СВАІМІ ПОСПЕХАМІ, А ПАДЛІЧЫЎШЫ РЭЗУЛЬТАТЫ, ПРАВЕРЫЎШЫ ПРОЙДЗЕНЫ ШЛЯХ, ІДУЦЬ ДА НОВЫХ ПЕРАМОГ.

УМАЦОЎВАЮЧЫ НОВА-СТВОРАНУЮ ПРАМЫСЛОВАСЦЬ І КАЛГАСНЫ ЛАД, НА СПРАВЕ ЗМАГАЮЧЫСЯ ЗА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ТВАІХ ЎКАЗАННЯЎ, РАЗІГРАМЛЯЮЧЫ АПАРТУНІСТАЎ І ШАВІНІСТАЎ УСІХ МАСТЕЙ, МЫ ЯШЧЭ ЦЯСНЕЙ ЗГУРТУЕМ СВАЕ РАДЫ ВАКОЛ ЛЕНІНСКАГА ЦК ВКП(б) І ЛЮБІМАГА ПРАВАДЫРА ПАРТЫІ І ПРАЦОЎНЫХ — ТАВ. СТАЛІНА.

НЯХАЙ ЖЫВЕ НА КАРЫСЦЬ РАБОЧАГА КЛАСА, НА СПРАВУ СУСВЕТНАЙ ПРОЛЕТАРСКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ ВЯЛІКІ ПРАВАДЫР ПАРТЫІ І РАБОЧАГА КЛАСА ТАВ. СТАЛІНІ

НА ГОМЕЛЬСКАЙ ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

ГОМЕЛЬ, 8. (Па тэлефону ад спец брыгады «Звязды»).

Сёння ў 7 гадзін вечара ў клубе Імя Леніна адкрылася 3-я гарадская партканферэнцыя. На канферэнцыю прыбыло 250 дэлегатаў з рашаючым і 135 з дарадным голасам.

— Большэвікі Гомельшчыны,—гаворыць адкрываючы канферэнцыю сакратар гаркома тав. ШЭФАРЭНКА, — верныя традыцыям Палескага камітэта і яго першага кіраўніка тав. КАГАНОВІЧА, прышлі да сваёй канферэнцыі моцна згуртаваным атрадам вакол ЦК КП(б)Б і ЦК ВКП(б), з радам буйных перамог на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. У рэзультаце правільнага праведзення ленінскай нацыянальнай палітыкі пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і асабіста тав. ГІКАЛО, пры актыўнай дапамозе ЦК ВКП(б), адстаты ў мінулым Гомель ператварыўся ў перадавы ін Аустрыльны цэнтр БССР. Ад імя канферэнцыі тав. ШЭФАРЭНКА запэўніў ЦК КП(б)Б, што гомельская партарганізацыя і надалей будзе ў перадавых радах КП(б)Б у барацьбе за генеральную лінію партыі.

У ганаровы прэзідыум канферэнцыі выбраны тт. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, ВАРАШЫЛАЎ, ДЗІМІТРАЎ, ЛЕНСКІ, ЛЫЧОЎ. На вітанне пасяджэнні заслуханы прывітанні і рапарты трактарыстаў МТС аб выкананні імі ўзятага на сябе абавязацельства па рамонту 22 трактараў да партканферэнцыі, ад калгаса 8-га сакавіка, выканаўчага свае абавязкі перад дзяржавай, нова-арганізаванага калгаса, і піянераў. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і т. Гікало.

На вечернім пасяджэнні быў заслуханы справаздачны даклад РК КП(б)Б.

БЯГОМЛЬ

7 студзеня райпартсход заслухаў даклад аб саўгасным і калгасным будаўніцтве. У спрочках дэлегаты спынуліся на тым, што партарганізацыя Бягомльшчыны слаба змагалася за лён.

План ільназагатовак па раёну да адкрыцця канферэнцыі выкананы толькі на 51 проц. Сход абавязаўся да XV з'езда КП(б)Б ва што-б там ні стала закончыць ільназагатоўкі.

У соцыялістычнае спаборніцтва на куткоўнае скончэнне ільназагатовак Бягомльшчына ўступіла з Плешчаніцкім раёнам, куды сход паслаў дэлегацыю.

Вечарам у той-жа дзень быў заслуханы даклад аб тэзісах к XVII партз'езду.

ЗАСЛАЎЛЬ

7-га студзеня, у 6 гадзін, адкрылася заслаўская раённая партканферэнцыя. Прэзідыум канферэнцыі выбран у складзе 17 чалавек. У ганаровы прэзідыум выбраны Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з тав. Сталіным, Бюро ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало, т. т. РУДЗУТАК, ТЭЛЬМАН, ДЗІМІТРАЎ, ЛЕНСКІ, ЛЫЧОЎ. На вітанне пасяджэнні заслуханы прывітанні і рапарты трактарыстаў МТС аб выкананні імі ўзятага на сябе абавязацельства па рамонту 22 трактараў да партканферэнцыі, ад калгаса 8-га сакавіка, выканаўчага свае абавязкі перад дзяржавай, нова-арганізаванага калгаса, і піянераў. Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК КП(б)Б і т. Гікало.

На вечернім пасяджэнні быў заслуханы справаздачны даклад РК КП(б)Б.

ПЛЕШЧАНІЦЫ

Райпартканферэнцыя адкрылася 7-га студзеня. Заслуханы даклад РК і РКК. Канферэнцыю віталі рабочыя саўгасу, прафарганізацыі і калгаснікі.

Пасланы прывітальныя тэлеграмы ЦК ВКП(б) — тав. Сталіну, ЦК КП(б)Б—тав. Гікало і рэдакцыі «Звязды».

У спрочках па першых дакладах запісалася 33 дэлегаты.

ВЫСТУПЛЕННЕ тав. ГІКАЛО НА БАРЫСАЎСКАЙ РАЙПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

БАРЫСАЎ, 8. (Па тэлефону ад нашага спецкар.).

Сёння, варочаючыся з армейскай партканферэнцыі Беларускай вайсковай акругі, тав. Гікало з тав Жоўскім прыехалі ў Барысаў для ўдзела ў работах райпартканферэнцыі.

З'яўленне тав. Гікало ў прэзідыуме сустакана дружнымі апладысментамі, пераходзячымі ў авацыю. Усе дэлегаты ўстаюць і аднадушна вітаюць стойкага большэвіка, выпрабаванага кіраўніка КП(б)Б. Зал гучна ўсклікае: «Нахай жыве ЦК КП(б)Б на чале з лепшым большэвіком-сталінцам тав. Гікало!»

У паўтаратадзінай прамове тав Гікало ахарактарызаваў асноўныя задачы давага этапа соцыялістычнага будаўніцтва, якія вытякаюць з тэзісаў па дакладах т. т. Молатава і Кагановіча да XVII партз'езда, асабліва завастраючы ўвагу канферэнцыі на неабходнасць павышэння пачуцця адказнасці кожнага комуніста за даручаны яму ўчастак работы.

— Тэзісы аб народна-гаспадарчым плане другой пяцігодкі, — гаворыць т. Гікало, — разгорнутая праграма пабудовы соцыялістычнага грамадства. Рэальнасць гэтай праграмы, выцякаючая з вучэння Леніна-Сталіна, даказана жыццём тымі перамогамі, з якімі прыходзіць партыя да свайго XVII з'езда

XV з'езд КП(б)Б сустадае з 15-годдзем БССР. Пройдзены этап знамянальны вялікімі поспехамі. Дасягнутыя поспехі гаспадарчага і на цыянальна-культурнага будаўніцтва БССР тав. Гікало ілюструе лічбамі і фактамі роста прамысловасці, рабочага класа, роста соўгасаў і калгасаў, спабжэння сельскай гаспадаркі трактарамі і машынамі, ростам школ і вышэйшых навучальных устаноў.

Разам з тым падкрэсліваецца што гэтыя поспехі не могуць нас задаволіць. Вы чыталі, — кажа тав. Гікало, — пастанову прэзідыума ЦВК СССР аб узнагародзе ордэнам Леніна рада рэспублік, краёў і абласцей. БССР, як вы ведаеце, не ўзнагароджана ордэнам Леніна. Значыцца, мы яшчэ не ўсюды працуем так, як гэта патрэбна. Тав Гікало тут-жа падкрэслівае, што Барысаўскі раён ідзе ў перадавых радах па выкананню рада важнейшых гаспадарча-палітычных задач У гэтым заслуга партарганізацыі Але многія раёны працуюць дрэнна. Гэтым і тлумачыцца невыкананне плана ільназагатовак, адкрыцця крэдытаў ЦК ВКП(б) аб надзяленні бескароўных калгаснікаў цёлкамі.

Прамысловасць БССР працавала ў гэтым годзе не зусім здавальняюча. Калі выконваецца, скажам, план на 90-92 проц., дык нашы гаспадарнікі падыяпаюць сябе: вось добра. Якога-ж чорта гэта добра? Хто-ж дасць нам ордэн Леніна за такую работу? — пытае тав. Гікало.

А БССР, як пагранічная рэспубліка, павінна вызначацца прыкладнасцю па рабоце ва ўсіх галінах ва ўсіх справах, і гэтага мы павінны дабіцца абавязкова ў 1934 годзе.

Далей, гаворачы аб задачах комуніста, вызначаных у праекце новага статута тав Гікало ўказвае што ад кожнага комуніста патрабуецца, каб ён быў сапраўдным арганізатарам мас, революцыйным важаком, каб ён добра вёў палітыку партыі, ведаў тэхніку сваёй справы, каб адчуваў павышаную адказнасць, быў рэвалюцыйна пільным ва ўсіх справах. Калі класавану ворагу, кулацкім, буржуазна-нацыяналістычным элементам удаецца пралезці ў нашы совецкія і культурныя арганізацыі, дык гэта таму, што комуністы дрэнна працуюць, не праяўляюць большэвіцкай пільнасці. У радзе выпадкаў прывыклі працаваць саноўна-панскімі метадамі. Усядзіцца ў кабінеце, абставіць сябе канцылярскімі прыладамі і штампуе, што яму пад соўваюць прадсядзіцель ў апарат чужакі. А ён думае: калі я комуніст дык тут уся контр-рэвалюцыя разбяжыцца. Не разбягаецца, аказваецца, а садзяцца вярхом на такога комуніста і скарыстоўваюць яго ў сваіх справах. Вось такія метады мы з коранем павінны вырваць.

У заключэнне тав. Гікало ўказаў на неабходнасць спалучаць усю штодзённую работу з умацаваннем абароназдольнасці нашай краіны яшчэ больш акружыць увагай і клопатамі нашу слаўную рабоча-сялянскую Чырвоную армію, гэтага непахіснага вартавога межаў краіны будуючагася соцыялізма.

***

Пасля выступлення на канферэнцыі тав. Гікало наведаў завод імя Домбаля, дзе пікавіўся работай і бытавымі ўмовамі рабочых.

***

На вечернім пасяджэнні канферэнцыя закончыла сваю работу.

Я. ІВАШЫН.

АДКРЫЛАСЯ 3-я КАНФЕРЭНЦЫЯ БОЛЬШЭВІКОЎ ВІЦЕБШЧЫНЫ

ВІЦЕБСК. (Па тэлефону ад нашай спец. брыгады). 8 студзеня 1934 года а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканні дзяржтэатра адкрылася 3-я партканферэнцыя.

Адкрываючы канферэнцыю, сакратар гаркома тав. ЖУРАЎЛЁЎ у сваёй уступнай прамове адзначыў агромадныя дасягненні, з якімі прышлі Совецкі Саюз і яго неадлучная частка — БССР да XVII з'езда ВКП(б). Большэвікі Віцебшчыны, ажыццяўляючы рашэнне ЦК КП(б)Б аб віцебскай партарганізацыі, прышлі да сваёй 3-й партканферэнцыі з вялікімі дасягненнямі на важнейшых участках гаспадарчага і культурнага будаўніцтва раёна, згуртаванымі радамі вакол ленінскага ЦК.

У прэзідыум канферэнцыі выбраны т. т. ГАЛАДЗЕД, КОНІК, ЖУРАЎЛЁЎ, АВЕРЫН, ВАСІЛЬКОЎСКІ (начальнік палітаддзела чыгункі) і інш.

Пад бурныя апладысменты перапоўненага зала па прапанове дэлегата ТАЎ віцебскай чыгункі і перадавых прадпрыемстваў у ганаровы прэзідыум выбраны: т. т. СТАЛІН, МОЛАТАЎ, КАГАНОВІЧ, КАЛІНІН, ОРДЖАНІКІДЗЕ, КУЙБЫШАЎ, АНДРЭЕЎ, ГІКАЛО, ТЭЛЬМАН, ДЗІМІТРАЎ і другія.

Канферэнцыю вітала 2-х тысячная дэманстрацыя ўдарнікаў віцебскага чыгуначнага вузла. У сваім рапарце дэлегаты адзначылі, што пад непасрэдным кіраўніцтвам палітаддзела і віцебскага гаркома чыгуначнікі маюць значныя дасягненні ў рабоце вузла. На аснове штодзённай барацьбы за выкананне гістарычных рашэнняў партыі і ўрада аб чыгуначным транспарце, чыгуначнікі правялі значную работу па ачыстцы вузла ад класавых ворагаў, сабатажнікаў, подыраў і разгільдзяяў. 2249 ударнікаў уключыліся ў вытворчы паход імя XVII партз'езда, арганізавалі 118 сталінскіх ударных брыгад.

— Мы спаборнічаем,—гавораць дэлегаты чыгункі,—з першым Маскоўскім і 4-м Акцябрскім раёнамі на права рапартаваць XVII партз'езду. Мы ўжо дабіліся рэзультатаў у барацьбе за паляпшэнне нашай работы. Процант хворых паравозаў з 30 даволі да 20. У нас няма адмаўлення ў выдачы паравозаў пад цягнікі. Нашы паравозы выходзяць пад цягнікі без спазнення.

Наш раён дабіўся сур'ёзных поспехаў у выкананні рэгуліровачнага задання. Крывая процанта следзвання цягнікоў упэўнена ідзе ўверх. У нас амаль зжыты выпадкі адпраўлення цягнікоў не па распісанню.

Канферэнцыя паслала прывітанне ЦК ВКП(б) т. СТАЛІНУ, ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛО, наркамаўнаму тав. ВАРАШЫЛАВУ.

Канферэнцыя паслала спецыяльны ліст 3-й гомельскай партканферэнцыі, у якім адзначыла вялікія поспехі дасягнутыя ў рэзультаце соцыялістычнага спаборніцтва Гомеля з Віцебскам. Большэвікі Віцебшчыны ў сваім лісце прапануюць гомельскім большэвікам прадоўжыць соцспаборніцтва паміж раёнамі на 1934 год.

Сёння канферэнцыя заслухае даклад ЦК КП(б)Б тав. ГАЛАДЗЕДА і справаздачны даклад сакратара гаркома тав. Жураўлёва.

ШЧАДЗІСТАЎ І БРАЙНІН.

ВЕТКА

Закончыла сваю работу веткаўская райпартканферэнцыя. Усе д

Студзень-рашаючы месяц для лесавывазкі

Сустрэнем XVII з'езд ВКП(б) поўным выкананнем студзеньскага плана

ЛЕСАВЫВАЗКУ—НА ПОЎНЫ ХОД

БССР прадаўжае ганебна адставаць у выкананні плана лесазагатовак і лесавывазкі. Дырэктыва ЦК КП(б)Б і СНК ад 4-га студзеня аб безадкладнай ліквідацыі прарыва не рэалізуецца. Барацьба за беспрабойную работу прамысловасці, Данбаса, за экспартны план не стала яшчэ ў цэнтры ўвагі значнай часткі раённых арганізацый. Замест большэвіцкай справы — горыя рэзалюцыі, спавесныя дэкларацыі, пустазвонства.

Першы квартал — рашаючы. Ён павінен даць не менш 30 проц. усяго гадавога плана. Гэта значыць, што за студзень, люты і сакавік патрэбна загатовіць 3.161 ТЫС. КБМ. ЛЕСАМАТЭРЫЯЛАЎ і 3.253 ТЫС. РАЎМЕТРАЎ ДРОЎ, вывезці адпаведна 3.565 ТЫС. КБМ. ЛЕСУ і 3.321 РАЎМЕТРАЎ ДРОЎ.

Акрамя таго, павінна быць забяспечана нармальная работа механізаваных і рацыяналізаваных пуцей лесагрэмгасаў шляхам падвозкі да іх 160 тыс. кбм. лесу і 530 тысяч раўметраў дроў. На СТУДЗЕНЬ прыпадае 40 ПРОЦ. УСЯГО КВАРТАЛЬНАГА ПЛАНА.

Як-жа ідзе выкананне задання? Замест таго, каб ударнай работай у першай палове студзеня перакрыць прарыў 4 квартала, лесазагатоўкі і вывазка яшчэ не выйшлі з прарыва раскачкі.

Больш таго. У ЛЕПЕЛЬСКІМ, ПОЛАЦКІМ, РАГАЧОЎСКІМ і некаторых іншых лесгрэмгасах тэмпы вывазкі нават ЗНІЗІЛІСЯ. Стварэнцца ўжыва пагроза правала плана ПЕРШАЙ ДЭКАДЫ, што ў сваю чаргу можа самым горшым чынам адлюстравацца на выкананні ўсяго студзеньскага плана. Нікалы прыняў ЛЕПЕЛЬСКІ лесгрэмгас (дырэктар МУХАЕЎ) за першую дэкаду павінен вывезці 100 тысяч кубометраў лесматэрыялаў і 13 тыс. раўметраў дроў. Вывезена за пяцідзённку: лесу — 11,9 проц., дроў — 20 проц. ЛЕПЕЛЬСКІ лесгрэмгас (дырэктар ПІКЕЛЬНІК) вывез лесу — 24 проц., РАГАЧОЎСКІ лесгрэмгас (дырэктар КРАЙЗЕЛЬМАН) — вывез — 9,5 проц. лесматэрыялаў і 20 проц. дроў. БЫХАЎСКІ лесгрэмгас (дырэктар КЕЗІН) — вывез 8 проц. лесу і 33 проц. дроў., УШАЦКІ лесгрэмгас (дырэктар ФІНКЕЛЬШТЭЙН) разлічваў заданне па вывазцы лесматэрыялаў на 9 проц., і па дровах на 7 проц.

Лесбел, лесгрэмгасы яшчэ не арганізавалі операцыйнага, ШТОДЗЕННАГА кіраўніцтва лесавывазкай. У гэтым галоўная прычына недапушчальна слабых тэмпаў работы.

Такое важнае палітычнае мерапрыемства, як заключэнне двухбаковых гаспадарчых ДАГАВАРОЎ паміж лесгрэмгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі, не выкарыстоўваецца як магутны рэзерв у фарсаванні вывазкі. Па раду раёнаў (Мазыр, Чачэрск, Капыль, Глуск) дагаворная кампанія фактычна САРВАНА асабліва па аднаасобнаму сектару. У гэтым значная доля віны падае на райвыканкомы, сельсоветы, якія не правялі папярэдняй масавай работы.

Далёка не ўсе калгаснікі ведаюць аб тым, што ўвесь заработак калгасніка, працуючага ў лесе, за выключэннем 20 проц., якія адлічваюцца калгасу, паступае ў распараджэнне калгасніка.

«Падпісана і з плеч дапой» — гэту анекдотычну адмаху з герояў Гры-боедаўскай комедыі, відаць, многія работнікі лесгрэмгасаў увялі дарэш, чым прамыя бязвінні святы і фразы аб тым, што лесазагатоўкі — важнейшая дзяржаўная справа. Няма ашчэдай барацьбы з сабатажнікамі лесавывазкі. З некаторых раёнаў паведамляюць, што вышэйшыя ў лес калгаснікі даюць рішучы прадухіляюць праны. Гэта гаворыць аб тым, што праца іх не арганізавана, не забяспечана тэхнікай кіраўніцтва, рабочы дзень не ўшчыльнёны.

Рэзерв устойлівага санчага шляху, забяспячэнне фуражом, арганізацыя грамадскага харчавання, і рад іншых стымулюючых моментаў, ствараюць усе ўмовы для рэзкага і спраўнага выканання плана вывазкі.

ЦК партыі і СНК БССР паведзілі ўсе арганізацыі, што ўсялякія спасылкі на нейі-б там ні было аб'ектыўныя прычыны, у тым ліку на ільназагатоўкі, будуць расцэньвацца, як апартуністычныя адносіны да важнейшага задання партыі і ўрада.

Усе кола рыхтуецца да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б). Перамогай на фронце лесавывазкі, большэвіцкай барацьбой за поўнае і своечасовае выкананне плана павінны адзначыць гэтыя гістарычныя даты раённыя арганізацыі, сельсоветы, лесгрэмгасы, калгасы.

Такі канёк не вывязе...

Кіраўнікі АСІПАВІЦКАГА лесгрэмгаса ў практыцы лесавывазкі падмянілі кіраўніцтва фармалізмам.

У нас усё ў парадку—дагаворы заключаны, чаго-ж яшчэ трэба?

Ход лесавывазкі

(За першую пяцідзённку студзеня ў адносінах да дзённага задання)

ПЕРАДАВЫЯ ЛЕСПРАМГАСЫ (У ПРОЦАНТАХ).

	Лесматэрыялы	Дровы.
Барысаўскі (Дырэктар ШУЛЬГІН)	46,6	91
Асіпавіцкі (Дырэктар ЛУНСКІ)	45	63,2
Дзяржынскі (Дырэктар ПАЎЛОЎСКІ)	79,5	120
Магілеўскі (Дырэктар ДЫМНІКАЎ).	87,8	45,3

ГАНЕБНА АДСТАЮЦЬ

Б.-Кашалёўскі (Дырэктар ЛЕЎЧАНКА).	9,3	29,8
Быхаўскі (Дырэктар КЕЗІК).	8,1	34,4
Ушацкі (Дырэктар ФІНКЕЛЬШТЭЙН).	9,8	6,8
Глускі (Дырэктар ГЕЙШТОРТ).	10,9	10
Ельскі (Дырэктар КУРЫЛАЎ).	19,5	18
Лельчыцкі (Дырэктар МУХАЕЎ).	11,9	20,5
Суражскі (Дырэктар КРАЙЗЕЛЬМАН).	9,5	20,7
(Дырэктар ВОЛЬПЕРТ).	10,5	1,4
Нараўлянскі (Дырэктар НАВІЦКІ).	27,3	13

ПЕРАДАВІКІ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАВЫВАЗКІ

Гадавы план ПОЛАЦКІМ лесгрэмгасам 30-XII—33 г. выкананы па загатоўцы будматэрыялаў на 100,3 проц., дроў — 101 проц., вывазцы будматэрыялаў — 100,4 проц., дроў — 101,1 проц. Экспарт — 127,7 проц., адгрузка прыпадзе Данбасу — 114 проц., заданне Віцебску па дровах выканана цалкам.

У дзень улагжэння трэцяй далёкавы маршрут крапяжа Данбасу, дроў Віцебску. Змагаемся за выкананне 40 проц. першага квартала да 17 з'езда партыі.

Сакратар РК КП(б)Б ВЕТРАЎ.
Старшыня РВК ШАБАЛТАС.
Дырэктар ЛПГ БАРОЎСКІ.

***

31-XII—33 г. ДЗЯРЖЫНСКІ раён гадавую праграму 1933 г. скончыў па будматэрыялах на 108,1 проц., загатоўцы дроў — 119,7 проц., вывазцы будматэрыялаў — 101 проц., рэалізацыі дроў па нарадах Лесабыта 110 проц., адгрузка экспартнага балансу — 122 проц., рудстойка Данбасу — 140 проц.

Абавязваемся да 17 партз'езда выканаць 50 проц. плана першага квартала 1934 года.

Сакратар РК КП(б)Б ДАМБРОЎСКІ.
Старшыня РВК ВАНСОЎСКІ.
Дырэктар ЛПГ ПАЎЛОЎСКІ.

***

План лесазагатовак, вывазкі і адгрузкі 1933 г. 4-га квартала Магілеўскім раёнам выкананы.

Старшыня РВК ПУШЧЫН.
Дырэктар ЛПГ ДЫМНІКАЎ.

Усебеларускія радыёперакліч аб ходзе лесазагатовак і вывазкі

8 14-га на 15 студзеня 1934 года роўна ў 0 г. 30 мін. ЦК КП(б)Б і СНК БССР праводзяць усебеларускую радыё-перакліч аб ходзе дрэвалесазагатовак і вывазкі і аб выніках правядзення дагаворнай кампаніі з калгасамі і сялянамі — аднаасобнікамі па лесазагатоўках і вывазцы.

Да мікрафона для даклада выкліканцы: сакратары райкомаў КП(б)Б, начальнікі палітаддзелаў МТС, старшыні РВК, старшыні РІК РСІ, дырэктары лесгрэмгасаў, сакратары райкомаў ЛКСМБ, старшыні райпрафсаветаў і рэдактары раённых газет.

Прапануем у часе падрыхтоўкі да радыё-перакліччу разгарнуць масавую працу сярод калгасаў, калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў вакол мабілізацыі іх на барацьбу за перакрыццё прарыва 4-га квартала ў першай палове студзеня і забяспячэння поўнага выканання плана першага квартала ў сартыментным разрэзе, каб Беларусь з адстаючай па лесу рэспубліцы заняла адно з першых месц у Саюзе, якое мы маем усе магчымасці заваяваць.

Агітмасавы ЦК КП(б)Б.
Упаўнаркамлеса СССР пры СНК БССР.

НА ВОПЫЦЕ ПЕРАДАВІКОЎ ВУЧЫЦЦА ПЕРАМАГАЦЬ

Дні, якія засталіся да 15 з'езда КП(б)Б ператварыць у дні баявога змагання за поўнае выкананне планаў ільназагатовак

ЗВОДКА АБ ХОДЗЕ ІЛЬНАЗАГАТОВАК ПА БССР

на 5 студзеня ў процантах

РАЁНЫ	Загатоўлена ўсяго ільнапрадукцыі	У тым ліку Силаносн. валакна	Трасты
ПА ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАХ			
1. Сенненскі	105,0	104,2	104,3
2. Полацкі	101,4	92,7	112,9
3. Дрысенскі	97,0	88,1	110,8
4. Чашніцкі	84,6	56,6	194,6
5. Бешанковіцкі	84,0	105,8	74,2
6. Шклоўскі	83,6	52,0	122,9
7. Бялыніцкі	82,6	58,1	71,2
8. Сіроцінскі	81,4	89,8	66,3
9. Суражскі	76,0	66,9	64,6
10. Лепельскі	75,4	53,3	78,0
11. Крупскі	75,2	55,2	24,9
12. Ушацкі	74,4	53,2	111,1
13. Гаралоцкі	72,6	63,2	63,5
14. Асвейскі	71,7	113,1	47,7
15. Расонскі	70,3	80,3	60,9
16. Талачынскі	70,1	101,3	35,6
17. Дубровенскі	67,6	47,8	69,0
18. Лёзненскі	64,4	42,0	58,9
19. Чавускі	56,8	65,7	27,1
20. Мсціслаўскі	52,3	52,1	50,5
21. Горацкі	43,5	39,0	112,5
Разам па ільнаводчых раёнах	74,3	60,1	72,6
ПА НЕІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАХ			
1. Ч.-Слабодскі	101,6	123,0	—
2. Хойніцкі	100,6	111,5	—
3. Старобінскі	94,9	114,7	—
4. Любаньскі	90,1	88,6	—
5. Вішэбскі	87,5	72,3	—
6. Слуцкі	83,3	100,6	—
7. Бобруйскі	82,5	135,5	39,0
8. Капыльскі	81,8	85,6	—
9. Менскі	81,8	68,3	—
10. Ст.-Дарожскі	80,8	75,6	—
11. Пухавіцкі	80,3	97,8	55,0
12. Рагачоўскі	77,1	88,1	51,9
13. Смалявіцкі	86,4	—	—
14. Тураўскі	76,5	77,4	—
15. Асіпавіцкі	76,4	64,8	—
16. Уздзенскі	73,3	62,2	—
17. Чэрвеньскі	73,0	73,9	—
18. Чэрыкаўскі	70,7	46,8	—
19. Вярэйскі	70,6	62,7	—
20. Аршанскі	68,0	57,5	39,4
21. Глускі	67,8	60,0	—
22. Мазырскі	66,7	60,2	—
23. Барысаўскі	66,2	54,1	—
24. Брагінскі	64,8	69,4	—
25. Быхаўскі	63,8	44,4	—
26. Жлобінскі	62,9	60,2	—
27. Заслаўскі	62,1	46,9	—
28. Чаўскі	61,5	54,6	—
29. Парыцкі	61,3	50,8	—
30. Веткаўскі	60,6	60,6	—
31. Рэчыцкі	59,3	61,2	—
32. Ельскі	58,8	46,3	—
33. Каспяровіцкі	57,3	39,7	49,6
34. Калінінскі	57,2	60,0	43,0
35. Магілеўскі	54,9	66,7	15,6
36. Крычаўскі	53,2	27,0	102,7
37. Тэраэхоўскі	52,4	—	—
38. Петрыкаўскі	51,5	49,2	—
39. Гомельскі	51,0	43,5	—
40. Уваравіцкі	50,8	48,0	—
41. Дзяржынскі	50,0	42,7	—
42. Клічаўскі	49,6	43,2	—
43. Лагойскі	49,4	41,4	—
44. Жыткавіцкі	48,1	44,4	—
45. Ч.-Польскі	47,2	33,0	36,0
46. Б.-Кашалёўскі	47,4	53,3	—
47. Гомельскі	43,6	38,0	—
48. Прапойскі	37,9	35,6	—
49. Лельчыцкі	36,4	35,6	—
50. Камарынскі	33,4	27,1	—
51. Плешчаніцкі	32,9	31,3	—
52. Нараўлянскі	33,8	26,1	—
53. Лоеўскі	32,3	28,2	—
54. Клімавіцкі	26,7	21,0	—
Разам па неільнаводчых раёнах	63,1	57,6	—
Усяго па БССР	70,2	59,0	71,1

СПЕКУЛЮЮЦЬ ІЛЬНОМ

ГАРАДОК. (Ад нашага спецкарэспандэнта).

Кантора райаддзялення Загатільна выводзіць процанты. Выводзіць штодзённа. Арыфмометр у руках статыста Ганчанка працуе бездакорна. Лічбы растуць чарадамі тэм самі. Гэта — не віна арыфмометра, не віна статыста; яны — фіксатары. Арганізатарам ільназагатовак павінен з'яўляцца загадчык канторы тав. Фурсаў.

Але не пытайцеся ў Фурсава, чаму гэта Гарадоцкі раён, які павінен даць ільнаваллю сярэднім лікам 8, здае сярэднім лікам 6,5 у той час як раённыя арганізацыі пакляліся загатовіць лён сярэднім лікам 10. Фурсаў не адказка. Фурсаў не ведае. У Фурсава «ўсемагут ны» статыст Ганчанка і... арыфмометр. Дый сам Фурсаў не арганізатар, а статыст, фіксатар.

У аднаасобным сектары план ільназагатовак выкананы на 40 проц. Яго лічыць пазазальнікам таго, што кулацкі сабатаж ільназагатовак не злоўлен, з'яўляецца той факт, што кулацкія гаспадаркі цвёрдыя заданні выканалі ўсяго на... 10 проц.

Сакратар РК КП(б)Б тав. Канавалаў гэты прапант лічыць «нераальным», ён знаходзіць, што ў сапраўднасці кулакі здалі крыху больш. Бачыце, на словах тав. Канавалава, заданне па кулацкіх гаспадарках было некалькі зменшана, а часткі гаспадарак цвёрдае заданне знята. Якая «дакладнасць»: «крыху», «некалькі», «з часткі». Нічым іншым як пяла-дэберальнымі адносінамі да кулака такое становішча назваць нельга. Як кулакі выконваюць цвёрдыя заданні на ільназадачы ў раёне не ведаюць.

Затое ў раёне, пачынаючы з райкома партыі і канчаючы канторай Загатільна, ведаюць аб іншым. Усе ведаюць, што ва ўсім раёне пышнота распаўнулася спекуляцыя ільном. Прадаюць і купляюць лён. Прадаюць і купляюць лён калгасы і аднаасобнікі. Прадаюць і купляюць дома і на рынку ў Гаралку. Трастой і вазяжном. На грошы, жыта, гарох, цвікі і муку. Мяняюць на інвентар, на розныя паслугі, і проста за літр водкі.

Спекулянткі рынак склаў ужо свае «цвёрдыя» цэны.

Як рэагуе на гэта райком? Ці ведомы яму факты спекуляцыі ільном? Ведомы добра. Сакратар РК КП(б)Б тав. Канавалаў на гэта гля дзіць так:

— Частка аднаасобнікаў план ільназагатовак не выканае (?), мы даем магчымасць ім купіць у калгасаў, якія план выканалі.

На справе-ж пад уплывам кулацкай агітацыі многія аднаасобнікі вяуць лепшы лён на рынак, прадаюць па спекуляцыйных цэнах, а горшы аддаюць дзяржаве. Вось да чаго вядзе спекуляцыя ільном. Гэтага гарадоцкія раённыя арганізацыі не разумеюць або не хочуць зразумець.

Спекуляцыя ільном — гэта новы маневр класавага ворага, накіраваны на зрыў ільназагатовак. Патураючы кулаку і сабатажніку, ідучы па лініі найменшага супраціўлення замест разгортвання масавай палітычнай і арганізатарскай работы па перавыкананню планаў ільназагатовак пераладзікамі калгасамі і аднаасобнікамі, у раёне свядома дапусцілі спекуляцыю ільном.

Гэты манеўр класавага ворага патрэбна разбіць неадкладна. Рыхтуючыся да XV з'езда КП(б)Б і XVII з'езда ВКП(б), разгортваючы палітычна-масавую работу сярод калгас нікаў і працоўных аднаасобнікаў, трэба дабіцца, каб яны падрыхтоўку да з'езда партыі адзначылі тымі высокаякаснага ільну звыш плана. Кулаку і сабатажніку — ні якай літасці Прымусіць іх здаць лён. Лён ёсць, ён наўмысле затрымліваецца кулацкімі элементамі.

А. М.

СІЛА ПРЫКЛАДА

Калі хочаце ведаць, як працуе калгас, паглядзіце, як ён здае лён. У нашым ільнаводчым раёне лён — люстэрка работы. Наш калгас «СОВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» першым у раёне здаў лён, выканаўшы план яшчэ ў канцы лістапада. Здаў не абы-як, толькі-б квіток атрымаць, а прадукцыю высокай якасці: 18 цэнт. валакна 9-10 нумара і 130 цэнт. трасты нумара 1,5.

Як мы дасягнулі гэтага?

Трасту мы рассцілалі па гатупках, пераляжваюцца не далі, ведалі, што гэта пагібель для ільну. Пільна сачылі за атрапоўкай, сартавалі трасту пры пад'ёме. Здавалі валакно добра адсартаваным, па даўжыні, колеру і моцнасці. Сартаванне — гэта галоўнае.

Лён значна ўзняў наш добрабыт. 3.300 дзён выпрацавалі калгаснікі на ільне. 37 цэнт. хлеба атрымалі за добрую якасць. Па 1 клг. на працадзень. Ды яшчэ 106 клг. масла, цукру, мыла, махоркі.

Наш гонар — 3-я брыгада. Брыгадзір ПЕТР ЦВЕТКОЎ, Наста і Марыя Карабань, Мар'я Ганчар, Прося Мацюціна (апошняя сачыла за ляжаннем ільну). Вось у каго вучыцца трэба. Калі ўсе яшчэ спалі, у 4 гадзіны раніцы выходзіла брыгада на работу, капчала ў 6-7 гадзін вечара. Часта ўсю ноч аддавала рабоце.

Трапалышчыцы 3-й брыгады паказалі, што пры жаданні можна атрымаць самы лепшы лён. На пункт адвозілі валакно 14-16 нумарам. Ніжэй 10 нумара не было. Педарма прыёмшчык хваліў наш лён.

А нормы? Іх перавыконвалі. Выпрацоўвалі па 6-7 клг. Сумленная праца з'явілася заручкай перамогі.

Скончылі здачу ільну. 30 трапалышчыц 3-й і іншых брыгад выступілі на соцыялістычную дапамогу адстаючым. Буксірная брыгада выехала ў калгас «Чырвоны Быстрак». Там нашы дзяўчаты убачылі сляды кулацкай работы. Дысцыпліны не было. Працавалі ледабайна, апусціўшы рукі. Выходзілі ў 10-11 гадзін. Трапалі так, што проста сорам адзін. Як быццам навіпасць адбывалі, а не кроўную справу рабілі. Не сартавалі лён перад мяцём, кідалі валакно пасля апрацоўкі куды папала, не падвязвалі кожную жменю, не глядзелі каб сартаваць па даўжыні, моцкасці і колеру.

Адкуль мог тут быць добры лён Педарма яго часта адсылалі назад, бракавалі, а калі прымалі, залічвалі ў шастёрку. Калгаснікі пверадзілі: «Лён дронны ўраджаўся». Прыехалі нашы і даказалі, што не лён дронны, а работа дронная. Пяць дзён працавала буксірная брыгада, перанесла суседзям свой вопыт, свае прыёмы: «Давайце патрэплем лён як след. Не паленіўся, тады пабачыце».

Трапалі днём і ноччу. Не шкадавалі сіл. Сартавалі не раз, падбіралі жменьку да жменькі, па ўсе правілах. І паказалі, як можна зрабіць з «дроннага» ільну добрае, мяккае, роўнае валакно. Раней вы трапоўвалі па 3-4 клг. Нашы ўдзяніцы паказалі, што можна дацягнуць, шэсць і больш. І не 6 нумара, а 8-10. Ударная брыгада ламала кулацкі сабатаж, падцягнула мясцовых дзяўчат.

І калгас «Чырвоны Быстрак» скончыў здачу ільну. На пленуме Лепельскага сельсавета старшыня Міхно Іван сказаў мне: «Хвала вашым. Вось гэта буксір».

Цяпер наша буксірная брыгада выехала ў калгас «Барацьбіт зелі» падцягнуць адстаючых, вывесці і яго наперад.

К. БЕЛЬСКІ.
(Старшыня калгаса «Совецкая Беларусь», Лепельскага раёна).

А пра жанчын забыліся

(Ліст жанарганізатара)

Работа з працоўнымі жанчынамі ў БАРЫСАЎСКІМ раёне ўзнавпадзе. Гэты важнейшы ўчастак партыйна-масавай работы кіруючымі арганізацыямі адносены да другарадных. Сярод адказных раённых работнікаў нямала можна знайсці такіх, якія заўяляюць, што работу сярод жанчын павінен праводзіць жанарганізатар. З прычыны таго, што апошняга ў раёне не было, райком партыі зняў з сябе ўсякую адказнасць за правал работы.

На кіруючых пасадах (старшыні калгаса, брыгадзіра, кладаўшчыка і інш.) у раёне няма ніводнай жанчыны. Ва многіх калгасах фармаль на ў склад праўлення ўведзены жанчыны, але ўдзел іх у кіраўніцтве абмяжоўваецца тым, што яны толькі наведваюць пасяджэнні праўлення.

Дырэктывы партыі аб вылучэнні жанчын на адказныя пасады ў Барысаўшчыне яўна ігнаруюцца. Гэта пацвярджаецца хоць-бы тым, што на пасадзе загадчыка МТФ у калгасе «Іскра» (Адзеецкі сельсавет) працавала жанчына, за ўдарную работу яна некалькі раз прэміравалася, але зусім па невядомых прычынах райземаддзел зняў яе з работы.

Пасля прыезда на працу жанорга ў палітаддзел Барысаўскай МТС, на месцах—у парт'ячэйках, сельсоветах, калгасах і нават райкоме партыі—я не магла атрымаць ніякіх вестак аб жаночым актыве.

За апошні час работа сярод жанчын значна ажывілася. Пры непасрэдным далажэнне кіраўніцтва палітаддзела ва многіх калгасах і сельсоветах праведзены злёты калгаснік-ударнік. Тры лепшыя калгаснікі-ударніцы вылучаны на злёт намеснікамі старшынь калгасаў. Жанчыны актыўна уключыліся ў самаправерку засыпкі і захавання насенных і страхавых фондаў і ход падрыхтоўкі да другой большэвіцкай весны 2-й пяцігодкі.

АЛЕСКЕР.

ДЗЕНІСКЕВІЧ

Заг. аддзелам кадраў ЦК КП(б)Б

ЗАДАЧЫ ПАДРЫХТОЎКІ І ВЫЛУЧЭННЯ КАДРАЎ

Да 15 з'езда КП(б)Б

«Сучасны перыяд соцыялістычнага будаўніцтва характарызуецца яшчэ большым ускладненнем задач, яшчэ большым павышэннем патрабаванняў, прад'яўляемых да кіраўніцтва. Асноўныя задачы другой пяцігодкі — канчатковая ліквідацыя капіталістычных элементаў, пераматанне перажыткаў капіталізма ў эканоміцы і свядомасці людзей, завяршэнне рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі на навейшай тэхнічнай базе, асваенне новай тэхнікі і новых вытрымленстваў, мацнейшая сельскай гаспадаркі і ўздым не працуючых мясцовасці — стаяць з усёй астрэтой пытанне аб павышэнні якасці работы ва ўсіх галінах, у першую чаргу, якасці арганізацыйна-практычнага кіраўніцтва». (З тэзісаў да даклада тав. Кагановіча на XVII з'ездзе ВКП(б).

Задача павышэння якасці работы, арганізацыйна-практычнага кіраўніцтва ва ўсю шыр стаіць перад партыяй праблему кадраў.

Дзякуючы пагамозе ленінскай на мянальнай палітыкі, пабудаваму аскіравальнаму генеральнай лініі партыі, пры дапамозе пролетарыята ўсяго Совецкага саюза ў БССР створаны новыя галіны прамысловасці (машынабудаўніцтва, тэксф. фасфарыты, будаўнічыя матэрыялы), па будаваны буйнейшы прадпрыемствы, арганізаваны тысячы калгасаў і дзесці совгасаў. Пашыраецца механізацыя сельскай гаспадаркі.

Кіраўніцтва гэтымі прадпрыемствамі патрэбне новых работнікаў, дастаткова падрыхтаваных і здольных асвоіць навейшую тэхніку вытворчасці.

Работа ў галіне падрыхтоўкі і падбора кадраў у БССР неадрыўна звязана з практычным правядзеннем ленінскай нацыянальнай палітыкі. На гэтым участку рашаюць пытаньні не вырошчвання новых большэвіцкіх кадраў з працоўнага насельніцтва БССР.

Контрэволюцыйныя падпалы емства, як заключэнне двухбаковых гаспадарчых ДАГАВАРОЎ паміж лесгрэмгасамі, калгасамі і аднаасобнікамі, не выкарыстоўваецца як магутны вагар у фарсаванні вывазкі. Па раду раёнаў (Мазыр, Чачэрск, Капыль, Глуск) дагаворная кампанія фактычна САРВАНА асабліва па аднаасобнаму сектару. У гэтым значная доля віны падае на райвыканкомы, сельсоветы, якія не правялі папярэдняй масавай работы.

Далёка не ўсе калгаснікі ведаюць аб тым, што ўвесь заработак калгасніка, працуючага ў лесе, за выключэннем 20 проц., якія адлічваюцца калгасу, паступае ў распараджэнне калгасніка.

«Падпісана і з плеч дапой» — гэту анекдотычну адмаху з герояў Грыбоедаўскай комедыі, відаць, многія работнікі лесгрэмгасаў увялі дарэш, чым прамыя бязвінні святы і фразы аб тым, што лесазагатоўкі — важнейшая дзяржаўная справа. Няма ашчэдай барацьбы з сабатажнікамі лесавывазкі. З некаторых раёнаў паведамляюць, што вышэйшыя ў лес калгаснікі даюць рішучы прадухіляюць праны. Гэта гаворыць аб тым, што праца іх не арганізавана, не забяспечана тэхнікай кіраўніцтва, рабочы дзень не ўшчыльнёны.

Рэзерв устойлівага санчага шляху, забяспячэнне фуражом, арганізацыя грамадскага харчавання, і рад іншых стымулюючых моментаў, ствараюць усе ўмовы для рэзкага і спраўнага выканання плана вывазкі.

ЦК партыі і СНК БССР паведзілі ўсе арганізацыі, што ўсялякія спасылкі на нейі-б там ні было аб'ектыўныя прычыны, у тым ліку на ільназагатоўкі, будуць расцэньвацца, як апартуністычныя адносіны да важнейшага задання партыі і ўрада.

Усе кола рыхтуецца да 15 з'езда КП(б)Б і 17 з'езда ВКП(б). Перамогай на фронце лесавывазкі, большэвіцкай барацьбой за поўнае і своечасовае выкананне плана павінны адзначыць гэтыя гістарычныя даты раённыя арганізацыі, сельсоветы, лесгрэмгасы, калгасы.

Такі-ж становішча і ў Наркамфіне і іншых наркаматах.

Якія-ж практычныя мерапрыемствы трэба правесці, каб задачу ў галіне падрыхтоўкі кадраў ва ўмовах БССР пасьпяхова вырашыць?

Зараз, пасля чысткі партыі, у кожнай ячэйцы, райкоме, усталёе трэба ўлічыць увесь выяўлены ў часе чысткі актыў і размеціць кандыдатуры на вылучэнне. Гэта адна з галоўных работ па замацаванню рэзультатаў чысткі.

Трэба больш рашуча вылучаць беспартыйных работнікаў, памяркуючы ўказанні Леніна аб давер'і і вылучэнні беспартыйнага актыва. У гэтых адносінах вялікую ролю павінны адыграць палітаддзелы З іх дапамогай трэба зараз вылучыць актыў праверэных калгасных работнікаў на ўмацаванне раённага і цэнтральнага апарата.

Чым кіраваўца пры вылучэнні работнікаў? Неабходна звярнуць увагу на дзелавыя якасці таварыша, вынікі яго мінулай работы, прадасць у правядзенні ім партыйнай палітыкі, яго класавая пільнасць — вось чым трэба кіравацца пры вылучэнні новых работнікаў.

Важнейшы шлях вырашэння задачы ў галіне кадраў — гэта падрыхтоўка работнікаў. Усебеларускай нарадай па кадрах пры ЦК КП(б)Б абмяркована план падрыхтоўкі кадраў на працяку зімовых месяцаў. Галоўная ўвага і гатым плане звернута на падрыхтоўку работнікаў для сельска-гаспадарчых машын (трактарыстаў, механікаў, малыгістаў), арганізатараў калгаснай вытворчасці (брыгадзіраў, старшынь калгасаў, загадчыкаў фермаў), кадраў для совгасаў (дырэктароў, загадчыкаў участкаў) работнікаў па жывёлагадоўлі, кіраўнікоў сярэдняга звяна ў прамысловасці, работнікаў МТС і т. д. Ад выканання гэтага плана падрыхтоўкі залежыць вырашэнне праблемы кадраў у бягучым годзе.

Каб гэту праграму выканаць, неабходна дасканала распрацаваць праграмы, каляндарныя планы. Падабраць адпаведных кіраўнікоў, прыцягваючы да выкладання кіруючых работнікаў. Работу розных курсаў трэба набудаваць на аснове калгулення і прапрацоўкі мясцовага вопыта.

За работу школ і курсаў павінны несці адказнасць кіраўнікі ўстаноў, сакратары адпаведных райкомаў і начальнікі палітаддзелаў.

Ужо назіраюцца непаладкі ў тэрмінах арганізацыі калгасных школ, як недаўкамплектаванне курсантамі (Гомель, Мазыр), незабяспечанасць матэрыяльнай базы (памяшканні, падручнікі), слабы склад выкладчыкаў, адрыў заняткаў ад мясцовага практычнага вопыта. Гэтыя недахопы павінны быць зараз-жа выпраўлены.

Трэба карэнным чынам палепшыць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў у вышэйшых тэхнікумах і ВТНУ. Рашэнне ЦК ВКП(б) аб гарадзенскім інстытуце, пастанова ЦК КП(б)Б аб гомельскім машынабудаўнічым інстытуце павінны быць пакладзены ў аснову работы ВНУ і тэхнікумаў. Трэба шырока развернуць соцыялістычнае памяжэ студэнтамі, выкладчыкамі і навучальнымі ўстановамі. Трэба зараз-жа дакамплектаваць с.-г. навучальныя ўстановы адпаведнымі кантынгентамі студэнтаў.

Работа навучальных устаноў павінна быць у цэнтры ўвагі парткамітэтаў і партарганізацый.

На практычнае выкананне плана падрыхтоўкі кадраў павінна быць мабілізавана ўвага ўсіх арганізацый.

XVII з'езд ВКП(б) мы павінны сустрэць шырока разгорнутай работай па ажыццяўленню ўсёй праграмы падрыхтоўкі і вылучэння новых кадраў з тым, каб даць нашай прамысловасці і сельскай гаспадарцы работнікаў - спецыялістаў, дасканала авалодаўшых апошнімі дасягненнямі навукі і тэхнікі, бязаварыя адказнасці ў справе будаўніцтва соцыялізма, генеральную лінію партыі.

Линейная калибровочная мишень LRT-BE4-V2

ПЕРАТВАРЫЦЬ ЖЫВЕЛАГАДОЎЧЫЯ СОЎГАСЫ ВА УЗОРНЫЯ РЭНТАБЕЛЬНЫЯ ФАБРЫКІ МЯСА І МАЛАКА

ТАК ПРАЦУЮЦЬ БОЛЬШЭВІКІ

Тонкія, энергічныя рукі пернова жэстам абхапілі галаву, схіленую над невялікай паперкай, з-за якой тых шкельцаў жахулівай шпарка сабеталі па фатах вочы:

—Новы год пры 6 дзён, а яшчэ трэба адаць не менш 30-35 галоў бекона... «Здамо Гэта ясна»,—упэўнена падумаў гэты палітаддзела свінгасгаса Бабінічы тав. Іоўчук.— Гады плаж будзе перавыкананы...

***

...У 1932 годзе—і раней—соўгас не выдаваў а прарыва. амаль усе загінулі збожжавыя. план мясаздачы



быў выкананы толькі на 43 проц. Якраз такі-ж процант аддаваў адыход на свінарніку.

5 мая 1933 г. Буйнейшы ў БССР соўгас Бабінічы займае адрод астатніх соўгасаў Аршанскага трэста 38-е месца па сьлёбе Новага дырэктара тав. Берэнштайна пачалася Умяшанне:—Пяўжо ў 1933 г. як і пры старым кіраўніцтве, саспадарка не выдавіць а прарыва?..

Адная сумненне прадаўжалася не доўга: у соўгас прыехалі палітаддзельцы і прынесці з сабой большэвіцкі стыль работы, цвёрдаю ўпэўненасць у перамогу.

15-га мая соўгас заняў трэцяе месца, а 25-га—першае

На 20 снежня свінаферма соўгаса дала 377 бекоцаў, а планам з пачатку года было прадугледжана адаць толькі 200. Прычым, тады ў кроцце развалася, калі адны бекоцы—парсючок 9 месяцаў вазяць 60-70 кгр., а соўгас адае па 85 кгр.

Непраўдападобна аднак — факт, факт, які мае сваю гісторыю і свае прадпасылкі...

***

Так Іоўчук апорыць: «У аснову всёй нашай работы была пакладзена барацьба за план»

Шырока разгарнулася масава-выхаваўчая работа. Не так як раней, не ў «апульна-соўгасным» маштабе, а дыферэнцыявана, выходзячы з умоў кожнага цэха. На свінаферме была арганізавана партыйна-комсамольская група. Спачатку палітаддзельцы самі праводзілі з рабочымі гутаркі, а пасля пачалі даручаць гэту работу парторгу, комсамольскаму шэфпоргу, арганізавалі групу агітатараў, дапамагалі, вучылі іх працаваць.

Шырока разгарнулася спаборніцтва. Комсамольцы высунулі прапанову—арганізаваць прадсоцабрэкі конкурс камбінатаў. Зараз гэты конкурс прысвячоны да дня адкрыцця XVII партыйнага з'езда. Гэта пасля таго, як соўгас атрымаў пераходны сцяг Аршанскага свінаводтраста.

Закіпела работа, бадзяй, большэвіцкая работа. І ў аснове яе ляжалі палітаддзельскія метады выхавання і арганізацыі рабочых-ударнікаў, памножаныя на шэсць гістарычных умоў т. Сталіна.

На свінаферме нямы больш ураўнілаўкі, нямы абязлічкі. Калі ў камбінаце № 2 за лістапад было здана толькі 8,5 цэнтн. бекона, і брыгадзір Раманаў атрымаў за месяц 137 р., а малодшы свінар—78 р., то ў камбінаце № 3, дзе пры тых-жа магчымасцях за той-жа час было здана 14,7 цэнтн., брыгадзір Лонскі атрымаў 168 руб., а малодшы свінар Алесенко Насця—98 руб.

Чаму ў Алесенко або ў Цітовай самаробныя паказальнікі па здачы бекона? Чаму ў іх бекоцаў сутачны прырост не менш 600-700 грам? Таму, што яны першымі зразумелі сутнасць сталінскіх умоў, па-ўдарнаму ўзяліся за аўладанне тэхнікай адкорма.

Не мала ёсць дзяўчат, што намяшаюць корму, выллюць у карыта і спакойны. А вось Цітова ды Алесенко—не так. Яны пільна сочаць за ядою да канца: можа падліць трэба, можа чаго падсыпаць.

І Цітова, і Алесенко, і Зінойчына Зося, і Гарбацэвіча, старэйшая свінарка соўгаса перамагаюць у барацьбе за план яшчэ і таму, што старанна вучацца не толькі ў гуртках, але і на рабоце ў сваіх кіраўніком інжынерна-тэхнічны персанал соўгаса—Зубрыцкі, Троснікаў, Гольдзіна, Падпорынава і інш—не сядзяць у канцыляриях, а з раніцы да вечара—на ферме.

А хіба мала чаму можна навучыцца ў дырэктара т. Берэнштайна?

Вясна мінулага года была сведкай такога факта. Прышоў у трэст Берэнштайн і кажа, што 300-400 праз сутачнага прыросту—мала, што гэту лічбу можна ўзняць да 600 і больш, што 9-месячны бекоцец пайшоў важыць не 50-60 кгр а 85-90. У трэсце пасмяяліся з прапановы Берэнштайна і ў паралку таварыскай парады напомнілі яму аб тым, што за «очковтирательство» б'юць... Але Берэнштэйн не адрэйфіў: у яго было вялікае жаданне, угрунтаванае глыбокімі ведамі, і зараз 600 пр. сутачнага прыросту і 85 кгр вагі 9-месяч нага бекоца ўзаконены НКСоўгасаў, як каледыцыйныя паказальнікі.

—Такіх вынікаў я дабіўся таму, што не толькі дэтальна вывучаў спосабы кармлення, але і «псіхалогію» свінні,—кажа т. Берэнштэйн,—яе нораў, запатрабаванні.

У кастрычніку ў камбінаце № 1 бекоцы апошняга перыяда адкорма страцілі апетыт. Прырост пачаў катастрафічна падаць. Свінары страцілі надзею. Але яе не страціў дырэктар. Ён аставаўся на камбінаце і ўзяўся сам за кармленне. Тамжа над карытам быў, прыдумая спосаб узняць апетыт бекоцаў: кашыца ежы насыпалася спецыяльна прыгатаваным аўсом, насычаным салявай расчынай, падмажаным жытам, і свінні пачалі выскрабаць капыцу да дна. Прырост пайшоў угару.

***

Кіраўніцтва соўгаса не мала зрабіла ў напрамку паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў рабочых. У бягучым годзе абсталяваны 2 двухкватэрных дамы, распачатае абсталяванне аднаго чатырохкватэрнага дома. Палітаддзельская газета «За большэвіцкую свінагадоўлю» арганізавала конкурс домагаспадынь на лепшую кватэру.

У мэтах паляпшэння грамадскага харчавання цэх соўгаса арганізаваў малочна-адкормачны пункт, у якім ужо ёсць 3 каровы, 5 свінаматак і звыш 20 подсвінкаў.

***

Соўгас па-ўдарнаму рыхтуецца да вясны. да XVII з'езда партыі. 25 студзеня будзе закончан ва ўласных майстэрнях рамонт трактараў, ссыпана і акартаўлена насенне. З 1 студзеня соўгас будзе здаваць бекоцаў ужо не па 85 кгр, а па 90...

Павялічваюцца тэмпы, паляпшаецца якасць.

І—

«для нас зусім ясна, што мы не змаглі-б з нашымі партыйна-комсамольскімі сіламі мабілізаваць работных на выкананне гаспадарча-палітычных задач соўгаса, калі-б мы не вазружылі сябе беспартыйным актывам»... Так заяўляюць дырэктар соўгаса і палітаддзел.

Віт. Даль.

Знішчэнне адыхода, высокі прырост залежаць толькі ад нас

Напярэдадні 15 з'езда КП(б)Б мы хочам падзяліцца з рабочымі свінагадоўчых соўгасаў і ўсімі працоўнымі БССР аб нашай рабоце на адказнейшым участку барацьбы за социялістычную жывёлагадоўлю. На ша свінагадоўчая брыгада № 4 соўгаса ІМЯ СВЕРДЛОВА (Дзяржынскі раён) яшчэ з вясны, адразу пасля прыезда палітаддзела, заключыла со цыялістычны дагавор з брыгадай МАРЫІ СЕРКО. Па ўсіх пунктах да гавора мы ўзялі пяршынства.

Трэба сказаць, што ўмовы работы ў нашай брыгадзе больш складаныя: мы знаходзімся на значнай адлегласці ад цэнтральнай сядзібы соўгаса, ды і свінарнікі нашы горшыя.

Што-ж забяспечыла нам перамогу?

Палітаддзел дапамог нам правільна расставіць сілы ў брыгадзе і ар-

Ударніцы соўгаса Імя СВЯРДЛОВА: СЕРКО Марыя і САРОКА Марыя.

ганізаваць працу. Брыгада была пераведзена на гаспадарчы разрахунак. Мы атрымалі цвёрдыя паказальнікі, за якія пазнны змагацца. Ад выканання прамфінплана залежыў заработак кожнага члена брыгады. Гэта дало вялікі штуршок для ліквідацыі абязлічкі ўнутры брыгады і дапамагло навесці сапраўдны парадак у свінарніках.

Мы не першы год працуем на ферме і ведаем, што свінні любяць чыстоту. Таму перш за ўсё мы ўзяліся за навядзенне чыстаты ў свінарніках, не шкадуючы сіл і часу.

У адным са свінарнікаў, які Арэнна пабудаваны, пачала скапляцца жыжа. Мы яе выносілі вёдрамі і дабіліся таго, што гэты, горш за ўсіх пабудаваны свінарнік стаў узорным па чыстаце.

Як правіла мы мыем кармушкі два разы шчоткай. Кармленне свіней праводзіцца па групах. Не толькі да кожнай групы, але і да кожнай свінні ў нас індывідуальны падыход. Як толькі заўважым, што свіння дрэнна сябе адчувае, адразу-ж яе ізалюем. У часе масавых апаросаў былі ўведзены кругласуточныя дзяжурствы ў свінарніках.

Апарасілася ў нас сёння, прыняла 8 парасят. Брыгадзір адразу заўважыў, што ў свінні зусім няма малака. Што-ж рабіць?

— Загінуць гэтыя парасяты — гаварылі ўсе.

Мы параділіся ў брыгадзе і пярэшылі даручыць нашаму брыгадзіру Сарока Марыі выгадаваць парасят. Спачатку яна ўзялася паіць іх пожачкай, але малако разлівалася і нічога не выходзіла. Тады дадумаліся і дасталі соску. Трэба сказаць, што выгадавалі мы гэтых парасят на-дзіва. Ні адзін з гэтых парасят не загінуў, ды і па вазе яны былі не менш першых других парасят.

Гэты штодзённы, уважлівы, клапатлівы догляд за стадам забяспечыў нам перамогу. Мы дабіліся знішчэння адыхода. Прырост як парасят, так і бекоцаў у нас быў вышэй, чым у іншых брыгадах. Гэта дало і больш высокі заработак. Наш брыгадзір у сярэднім зарабляў па 140 рублёў у месяц, а малодшы свінар па 120 руб.

Прысылалі нам загадчыкам на ферму нейкага Грыневіча. Мы адразу адчулі, што гэты чалавек не наш. Не гледзячы на забяспечанасць кармамі, рацыёны не вытрымліваліся. Грыневіч наўмысна забыткаў гаспадарчы разрахунак і прынёс на работу кулакоў, якія шкодзілі нам. Наша брыгада страціла першынства. Мы адразу звярнуліся за дапамогай у палітаддзел. Грыневіча хутка прагналі.

Уключыўшыся ў вытворчы паход імя з'езду партыі, мы абавязаліся ў найкарацейшы тэрмін ліквідаваць спадчыну школьніка Грыневіча і зноў заваяваць першынства. Сёння мы з гонарам можам заявіць:

Узятыя на сябе абавязацельствы намі выкананы. Мы зноў дабіліся знішчэння адыхода. 32 адкормленыя намі бекоцы гатовы да здачы. Кожны з іх важыць не менш 85 кілаграм. Прырост у дзень быў не менш 690 грам.

Практыка нас пераканала, што знішчэнне адыхода, высокі прырост, выкананне плана 1934 г. залежаць толькі ад нас. Мы абяцаем у 1934 годзе працаваць яшчэ лепш і пад кіраўніцтвам палітаддзела ператварыць наш соўгас ва ўзорную рэнтабельную гаспадарку.

Да гэтага мы заклікаем усіх рабочых свінагадоўчых соўгасаў БССР

АД ІМЯ 4-й БРЫГАДЫ СОЎГАСА ІМЯ СВЯРДЛОВА: БРЫГАДЗІР САРОКА МАРЫЯ, СВІНАРКІ: КЛЮХ КАЦЯ І КЛЮХ АЛЬВІНА.

Бугай Аксфордскай пароды ў соўгасе УВАРАВІЧЫ ў 4-гадовым узросце важыць 810 кгр., яго сын бугаёк «МІША» ў 4-месячным узросце важыць 210 кгр.

ПЕРАМОГІ СОЎГАСА „НАЧА-ШПАКОЎШЧЫНА"

ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО, РЭДАКЦЫІ ГАЗЕТЫ „ЗВЯЗДА"

СВІНАГАДОЎЧЫ СОЎГАС «НАЧА-ШПАКОЎШЧЫНА» (ПОЛАЧЧЫНА) НА АСНОВЕ ПРАВЯДЗЕННЯ Ў ЖЫЦЦЕ Ў СВАЁЙ ВЫТВОРЧАСЦІ ШАСЦІ ГІСТАРЫЧНЫХ УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА ё РАЗГОРТВАННЯ МАСАВАЙ РАБОТЫ ПАСПЯХОВА ЗАКОНЧЫЎ ПЕРШЫ ГОД ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ.

15-МЕСЯЧНЫ ПЛАН МЯСАЗДАЧЫ НА 22 СНЕЖНЯ ПЕРАВЫКАНАН ЯК ПА БЕКОНУ, ТАК І ПА САЛЬНАМУ АДКОРМУ. ЗАДАННЕ — 369 ЦЭНТНЕРАЎ ЗДАНА 380 (103 ПРОЦ. ВЫКАНАННЯ ПЛАНА). ЗАДАННЕ ПА МАСЛУ ТАКСАМА ПЕРАВЫКАНАНА — ЗАМЕСТ 10 ЦЭНТН. ЗДАНА 10,5.

НАЧАЛЬНІК ПАЛІТАДДЗЕЛА тав. МІРУЦ.

САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ ДА ХУ З'ЕЗДА КП(б)Б І ХУП З'ЕЗДА ВКП(б) РАБОЧЫМ КАЛЕКТЫВАМ ВЫКОНВАЮЦЦА З ПОСПЕХАМ. ПОЎНАСЦЮ АДРАМАНТАВАН СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫ ІНВЕНТАР, ССЫПАНА І АЧЫШЧАНА НА СЕВНЕ: АЎСА 147 ЦЭНТНЕРАЎ, ЯЧМЕНЮ 53 ЦЭНТНЕРЫ, ВІКІ 136 ЦЭНТНЕРАЎ.

ЗАРАЗ СОЎГАС ПЕРАКЛЮЧЫЎСЯ НА ВЫВАЗКУ ГНОЮ І МІНЕРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ. СВІНАГАДОЎЧАЯ ФЕРМА РЫХТУЕЦЦА ДА МАСАВАГА АПАРОСА.

ДЫРЭКТАР СОЎГАСА АРШАНСКІЙ.

НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛА МІРУЦ.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАННЕ ПЛАНА 1934 ГОДА

ЦК КП(б)Б—т. ГІКАЛО, СНК БССР—т. ГАЛАДЗЕДУ, ЦО КП(б)Б „ЗВЯЗДЗЕ"

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б НА АСНОВЕ ШЫРОКА-РАЗГОРНУТАГА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА І ЎДАРНІЦТВА СВІНАСОЎГАС ГОРКІ-АБЧАК УСТУПАЕ Ў ДРУГІ ГОД 2-й ПЯЦІГОДКІ З ПОЎНЫМ ВЫКАНАННЕМ ПЛАНАЎ ЗДАЧЫ ТАВАРНАЙ ПРАДУКЦЫІ ДЗЯРЖАВЕ.

26 СНЕЖНЯ СОЎГАС АДГРУЗІЎ АПОШНІЯ 6,6 ТОН МЯСА І ТЫМ САМЫМ ЗАВЯРШЫЎ ВЫКАНАННЕ ГАДАВОГА ПЛАНА — ЗАМЕСТ 896 ЦЭНТНЕРАЎ ЗДАНА 902 ЦЭНТНЕРЫ, ШТО СКЛАДАЕ 101,6 ПРОЦ. ПЛАНА. МАСЛА ЗДАНА 1800 КІЛА ГРАМ — 128 ПРОЦ. ЗАДАННЯ.

ЗАРАЗ У СОЎГАСЕ РАЗГАРНУЎСЯ ВЫТВОРЧЫ ПАХОД ІМЯ XVII З'ЕЗДА ВКП(б). РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ СОЎГАСА МАБІЛІЗУЕ ЎСЕ СВАЕ СІЛЫ НА БОЛЬШЭВІЦКУЮ БАРАЦЬБУ ЗА ВЫКАНАННЕ ПЛАНА 1934 ГОДА, ЗА ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ ПРАДУКЦЫІ.

ДЫРЭКТАР СОЎГАСА ЦЕСЯРУК.

НАЧАЛЬНІК ПАЛІТАДДЗЕЛА НАВАЛАЕЎ.

ТРЭСТАЎСКІ РАТАТАР ПРАЦУЕ БЕЗДАКОРНА

Адной з асноўных праблем, пастаўленых Цэнтральным Камітэтам партыі, асабліва зараз, у перыяд падрыхтоўкі да XVII партз'езда, з'яўляецца палепшанне ўсё яшчэ адсталага ўчастка сельскай гаспадаркі — жывёлагадоўлі. Задача заключаецца ў тым, каб суспрэць партыйны з'езд новымі дасягненнямі ў жывёлагадоўлі, рашуча ліквідаваць усе недахопы.

У святле гэтай важнейшай задачы асабліва ярка кідаецца ў вочы зусім недапушчальнае становішча з свінагадоўляй у радзе соўгасаў сістэмы Аршанскага свінаводтрэста. Канкрэтным прыкладам можа служыць соўгас КАНІЧЫ, Касцюковіцкага раёна.

Соўгас арганізаваны у 1931 г. па ініцыятыве дырэктара Аршанскага свінаводтраста АСКЕРКА. Але трэба проста сказаць, што ініцыятыва гэта была далёка апярэдаў. Добра ведаючы, што для любога жывёлагадоўчага соўгаса патрэбна ў першую чаргу ўласная кармовая база, Аскерка пры арганізацыі соўгаса «спланаваў» яго так, што якраз цэнтральны ўчастак, дзе размешчаны галоўныя будынкі і асноўнае свінагадоўле, яе мае мінімума зямлі. Ворная плошча гэтага ўчастка, у якім налічваецца 140 свінаматак і больш 1.000 адгадзьнага поголаўя, складае ўсяго ... 126 га. Зусім ясна, што гэтага рабіць нельга было тым больш, што былі ўсе магчымасці арабіць цэнтральным участкам цэнтральны другі ўчастак, які знаходзіцца на адлегласці 12 кілометраў ад галоўнага ўчастка — каля станцыі Комунары. Не гаворачы ўжо аб блізкасці чыгункі, гэты ўчастак адзначаецца тым, што ён мае вялікую плошчу зямлі, якая ў шмат раз лягчэй вырашыла-б пытанне аб кармовай базе і пасьбішчы для свіней.

Аскерка, з дазволу сказаць, спланаваў соўгас і на гэтым паставіў крыжу. Даводзіцца сказаць, што за ўвесь час — больш двух год — Аскерка не палічыў нават патрэбным навядаць соўгас. Не толькі дырэктар, але і іншыя адказныя работнікі трэста надавычай рэдкія госці ў соўгасе. Штодзённае аперацыйнае кіраўніцтва соўгасамі трэст ажыццяўляе пры дапамозе рататара і бясконцым патокам чынноўніцка-бюракратычных пыркуляраў. Рататар працуе бездакорна.

Такое «кіраўніцтва» прыводзіць да таго, што трэст «не заўважыў, як у соўгасе арганізаваліся контрраволюцыйнае школьніцкае гняздо на чале з былым дырэктарам Матэўсіным. Гэ тыя школьнікі на працягу двух год бесперашкодна арудавалі ў гаспадарцы, прывялі яе чуць не да поўнага развала. За 1932 год адыход свінога паголоўя склаў 75 проц.

Дзейнасць гэтай школьніцкай шрай яшчэ да гэтага часу воспра адчуваецца. Становішча ў соўгасе яшчэ вельмі напружанае. Пачнем з кармоў. Палітаддзел не раз ставіў пытанне перад трэстам аб катастрафічным становішчы з кармамі, аб сістэматычных перабоях у завозе іх на нарадах. Аднак, трэст заставаўся і да гэтага часу застаецца глухім да сігналаў палітаддзела... Былі выпадкі, калі ўсё пачалёўе цэлым тыдзнямі кармілася адной толькі бульбай. Гэта парушала сістэму адкорма і прыводзіла да пагаршэння вагі свіней, да зрыва плана адкорма і мясаздачы дзяржаве. І да гэтага часу пытанне аб кармах не вырашана.

Такую-ж «аперацыйнасць» праяўляе трэст і ў адносінах поваага будаўніцтва. Апошнае зрываецца з-за адсутнасці неабходных будматэрыялаў (цэгляў, шкла, тёла-лесаматэрыялаў, толя і інш.). Бюракраты з трэста займаюцца толькі абяцаннямі і казённымі адпісками.

Соўгас у надзвычай цяжкім фінансавым становішчы. Запазычанасць па зарплаце рабочым-будаўнікам большая, чым за чатыры месяцы, а рабочым соўгаса ўжо таксама звыш двух месяцаў не выдаецца зарплата. Трэст лічыць, што зарплата рабочым — справа апошняя. І, выходзячы з гэтай «устаноўкі», ён затрымлівае нават тыя сродкі, якія Наркамсоўгасаў спецыяльна адпусціў для ліквідацыі запазычанасці па зарплаце.

Нельга не адзначыць і недапушчальную абыякавасць да гаспадарчага кіраўніцтва соўгасам з боку Наркамсоўгасаў. Адзел кадраў НКСоўгасаў не прымае мер да хутчэйшай прызначэння дырэктара. Нямала ў соўгасе і ветэрынарнага доктара, якога трэст усё абяцае прысланць, але гэтыя абяцанкі цягнуцца ўжо 6 месяцаў. Нафрад ці трэба даказваць, што ветэрынарны доктар неабходзен для свінагадоўчага соўгаса.

***

Палітаддзел паставіў перад собай задачу — канчаткова ліквідаваць цяжкую спадчыну, пакінутую контрраволюцыйнай школьніцкай групай, дзейнічаўшай у соўгасе. У сувязі з падрыхтоўкай да 17 партз'езда ў соўгасе абвешчан вытворчы паход імя з'езда. Гэты паход выклікаў шырокі ўздым сярод рабочых соўгаса. Работа ў свінарніках прыкметна палепшылася. Адыход маладняка за апошні час знізіўся да 2 проц., прырост у вазе даходзіць цяпер да 700-800 грам у суткі замест ранейшых 300-350 грам.

Брыгады свінарак разгарнулі паміж сабой соцыялабарніцтва і ўдарніцтва. У брыгадах ідзе актыўная барацьба за пераходны сцяг палітаддзела. У гонар 17 партз'езда арганізаваны гурток, у якім свінаркі асвойваюць тэхніку свінагадоўлі, вывучаюць асноўныя правілы зоатэхнікі. Барацьбу за сцяг палітаддзела праводзяць пад лозунгам: да 17 партз'езда ліквідаваць непісьменнасць у зоатэхніцы.

Мабілізуючы партыйна-комсамольскую арганізацыю, усю масу рабочых на ажыццяўленне дырэктыў партыі і ўрада аб свінагадоўлі, соўгас Канічы безумоўна выйдзе на шасцю з паласы прарываў, у якой ён знаходзіўся. Гэта будзе тым хутчэй, чым хутчэй Аршанскі свінаводтрэст рашуча перабудуе сваю работу, паверненца тварам да соўгаса.

НАЧ. ПАЛІТАДДЗЕЛА СОЎГАСА КАНІЧЫ, КАСЦЮКОВІЦКАГА РАЁНА С. Я. ПЯТРОЎ

КІРАВАЦЬ КАНКРЭТНА І АПЕРАЦЫЙНА

За апошнія два гады мы дабіліся вялікіх зрухаў у соўгасным жывёлагадоўлі. Паголоўе буйнай рагатай жывёлы ў соўгасах БССР (сістэма Упраўдарамясагасаў) узрасло з 26.9 тыс. галоў у 1930 г. да 41,19 тыс. галоў у 1933 г. Паголоўе свіней за гэты час узрасло з 24,5 тыс. галоў за 113,72 тыс.

У соўгасах пачаўся прырост паголоўя, значна палепшыўся адыход маладняка. Так процант гібелі цялят да 1 года знізіўся з 35,6 проц. у 1931 г. да 12,9 проц. у 1933 г. Адыход парасят да двух месяцаў знізіўся з 44,5 проц. да 30,2 проц.

Такім чынам, калі ўзяць у цэлым жывёлагадоўчыя соўгасы, дык яны зараз працуюць значна лепш, чым у 1931-32 годзе. Але калі падыйдзем да кожнай гаспадаркі, то атрымаем зусім розныя малюнкі.

Мы бачым, што лепшыя соўгасы ў выніку правільнага догляду утрымання, кармлення рагатай жывёлы і свіней дабіліся максімальнага зніжэння адыхода, павышэння прадуктыўнасці жывёлагадоўлі, поўнага выканання сваіх абавязкаў перад дзяржавай і т. д.

Так, напрыклад, па соўгасу Каралёва (племтрэста) адыход цялят не перавышае 1.5 проц. Па соўгасах Александрова, «Ударнік», імя Гея і інш. адыход парасят знізіўся да 9,5 проц. і нават да 6 проц. Удой па соўгасах Кіраліёва і Рачкавічы (Менмелітрамтраста) у сярэднім на адну фуражную карову дасягалі 8-9 літраў у дзень у летнія месяцы, пры сярэдніх удоях па соўгасах трэста у 4 літры.

Соўгас ІМЯ ДЗЕРЖЫНСКАГА, Менсвінаводтраста, з'яўляецца рэнтабельнай гаспадаркай. 1932 гаспадарчы год соўгас скончыў з чыстым прыбыткам у 8.668 руб. 1933 год соўгас таксама скончыў са значным чыстым прыбыткам. Гэты соўгас ідзе ў першых радах па выкананню гаспадарча-палітычных кампаній: азімая сяўба была скончана сваячасова на 100 проц., план хлебаздачы (889 цэнт.) быў выкананы поўнасцю, а 15-месячны план мясаздачы на 1-е студзеня поўнасцю выкананы (1.053 цэнт.), у тым ліку 226 галоў бекона. Якасць здаваемага ў чацвертым квартале бекона ў соўгасе палепшылася: сярэдняя вага бекоцнага паросёнка дасягае 86 кгр. Соўгас выканаў план маслаздачы на 160.6 проц. Сярэдні ўдой каровы ў сталае соўгаса за першыя тры кварталы 1933 г. дасягаў 6.4 літра ў дзень, па трэсту 4 літры. Адыход парасят ва ўзросце да двух месяцаў у 1933 годзе на 10 проц. ніжэй чым у сярэднім па трэсту. Соўгас дабіўся значнага зніжэння сабекошта прадукцыі (у 1½-2 разы ніжэй чым па трэсту). Усіх гэтых поспехаў соўгас дабіўся шляхам правільнай арганізацыі працы на аснове здзелыччыны і разгортвання соцыяпаборніцтва і ўдарніцтва, шляхам стварэння належных культурна-бытавых умоў для рабочых і ІТР (дыферэнцыраванае рабочае снабжэнне, сталовая з адкормачнікамі і малочнай фермай, дзіцячыя яслі, плацоўка, клуб і т. д.).

Соўгас УВАРАВІЧЫ — адзін з лепшых у сістэме Гомельскага малакопрамтраста: ён па-ўдарнаму праводзіць усе гаспадарча-палітычныя кампаніі: весняная сяўба была скончана на 20 дзён раней тэрміна, соўгас сваячасова і без страт убраў ураджай збожжавых і бульбы, на 15 верасня соўгас скончыў пасеў азімага жыта і т. д. Над жывёлагадоўлю соўгас надзвычай моцную кармавую базу, забяспечыўшы яе ў асноўным шляхам павышэння ўраджайнасці сваіх палёў. У выніку поўнага выканання агратэхніка, соўгас Уваравічы ў сярэднім у 1933 годзе атрымаў ураджаю з аднаго га: жыта 11 цэнт., аўса 10, ячменю 13 цэнт., і т. д., 10 га звышраннага пасева аўса далі па 20 цэнт. з аднаго гектара.

У выніку правільнага догляду, утрымання і кармлення жывёлы, упартай барацьбы за захаванне маладняка (адыход цялят знізіўся да 4 проц.) соўгас дабіўся рэнтабельнасці гэтай галіны сваёй гаспадаркі. Удой кароў падняўся да 1.450 літраў у год на адну фуражную карову. Асобныя каровы пасля ацёла даюць па 20-25 літраў малака ў дзень. Сабекошт аднаго літра малака не перавышае 25 кап.

Соўгас разгарнуў значную работу па паляпшэнню якаснага складу стада шляхам метыскі стада. Соўгас Уваравічы поўнасцю выканаў свае абавязацельствы перад дзяржавай па малаку, мясу і збожжу. Усе гэтыя поспехі соўгас Уваравічы атрымаў у выніку правільнай арганізацыі працы, укаранення здзелыччыны, шырокага разгорнутага соцыяпаборніцтва і ўдарніцтва і выразнага аперацыйнага кіраўніцтва з боку дырэкцыі соўгаса, ажыццяўлення ў штодзённай практыцы соўгаса шасці гістарычных умоў т. Сталіна.

Соўгас БАБІНІЧЫ (Аршанскага трэста), дырэктар т. Берэнштэйн, палітаддзела т. Іоўчук за буйныя поспехі ў арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні гаспадаркі за ўзорную работу і выкананне абавязкаў перад дзяржавай пастановай ЦК занесен на чырвоную дошку.

Побач з гэтымі перадавымі гаспадаркамі, мы маем не мала і такіх, якія цягнуць нас назад. Узяць, напрыклад, соўгасы Паўлаўка, «Далёкая ніва», імя Блюхера і інш. У гэтых соўгасах парасяты рэгулярна недакармліваюцца. Парасятам даюць неплюшчаны, непалжараны авёс. У соўгасе імя Блюхера свінні рэгулярна недапойваюцца.

У соўгасе Паўлаўка парасяты не атрымліваюць мінеральнай падкормкі, падсосныя і паросныя маткі не выганяюцца на прагулку.

Усе гэтыя факты прыводзяць да вялікага адыхода маладняка.

У чым прычыны дрэннай работы гэтых соўгасаў? У тым, што ў гэтых гаспадарках і радзе іншых не захоўваюцца правілы догляду жывёлы. Абслугоўваюць персанал родка калі бывае на месцы. Зоатэхнікі, ветдоктар, санітар, дырэктар соўгаса родка заглядаюць у свінарнік. Парасяты свабодна бегаюць па свінарніку і па станках. За свіннямі няма індывідуальнага догляду. Усё гэта стварае спрыяльныя ўмовы для палзежа.

Бясспрэчна, ёсць рад выпадкаў няправільнага, школьніцкага планавання пры арганізацыі соўгасаў: ігнараванне ўласнай кармавой базы, арганізуемых соўгасаў, арганізацыя свінагадоўчых соўгасаў за 30-40 клм. ад чыгункі пры надзвычайна слабай кармовай базе, калі трэба завозіць у гэтыя соўгасы асноўныя масы кармоў; у сувязі з гэтым паўстае пытанне аб перагляде спецыялізацыі раду соўгасаў. Так, напрыклад, у соўгасе СВІСЛАЧ, свіное стада дасягае 700 галоў, пры 90 свінаматках. Гаспадарка соўгаса мае ўсяго 150 га ворнай зямлі. Але затое ў соўгасе ёсць вялікая плошча сенажацяй. Калі ў соўгасе Свіслач некалькі па меншыць свінапагалоўе, а за лік свіней павялічыць паголоўе кароў, дык соўгас у выніку толькі выграе і стане больш рэнтабельным.

Безумоўна, можна знайсці таксама і рад малочных соўгасаў, якія не маюць натуральных выпасаў, але ў іх ёсць іншыя ўжыткі, яны могуць выбраць значную колькасць канцэнтратаў, або знаходзяцца на невялікай адлегласці ад чыгункі і могуць быць лепш забяспечаны канцэнтратамі, гаранцуючымі развіццё рэнтабельнай свінагадоўлі.

Пакідаючы свінню асноўнай вядучай галіной свінасоўгасаў, неабходна апошнім даваць поўную колькасць буйной рагатай жывёлы. Зусім дрэнна, калі ў радзе соўгасаў («Вызваленне» і інш.) на кожныя 100 га ворнай зямлі прыпадае толькі 4 каровы. Пры такіх умовах пытанне падкормкі парасят малаком зусім выключаецца.

Наадварот, у малочных соўгасах з-за адсутнасці свіней астаецца значная колькасць кармавых рэсурсаў (малочныя адыходы) нескарыстанымі, што зусім немэтазгодна.

Пытанне паляпшэння стада соўгасаў з'яўляецца адным з галоўнейшых у справе прадукцыйнасці жывёлагадоўлі гэтых соўгасаў. Якасны склад стада, па яго пародзнасці яшчэ зусім нізкі. Так па соўгасах трох малочных трэстаў чыстапародны скот складае ад 6 да 13 проц. ад агульнага стада, а з метысамі процант палепшанага стада не перавышае 30 проц.

Гэта значна адбіваецца на мясной і малочнай прадукцыйнасці рагатай жывёлы. Гадавы ўдой на адну карову ў 1933 годзе па соўгасах сістэмы павялічыўся на 40 проц. параўнальна з 1931 годам, (з 686 да 960 літраў), у той час, як пры забяспечанасці кармальнага кармлення і ўтрымання можна было-б гэтыя ўдоі падвоіць.

Практыка работы соўгасаў за апошнія гады паказала ўсю нягодную сутнасць, нерэнтабельнасць арганізацыі жывёлагадоўлі выключна на завазных кармах. Пры гэтым, дзяржава трапіць вялізарнейшыя сродкі на транспартаванне кармоў, перагружаецца чыгуначны транспарт. Патрэбнасць соўгасаў у цягавай сіле павышаецца ў некалькі разоў. Надзвычай павялічваецца са бекошт адзінкі прадукцыі.

Для далейшага паспяховага развіцця жывёлагадоўлі ў соўгасах трэба поўнасцю забяспечыць жывёлу кармамі. Таму галоўнейшай задачай кожнага соўгаса з'яўляецца стварэнне моцнай устойлівай кармавой базы ўнутры самой гаспадаркі, прывязанне паголоўя жывёлы соўгаса ў поўную адпаведнасць з наяўнымі магчымасцямі пашырэння кармавой базы.

Зараз ва ўсю шырыню пастаўлена задача пашырэння вытворчасці неабходных кармавых рэсурсаў унутры самой гаспадаркі. Адной з магчымасцяй пашырэння кармавой базы ў свінасоўгасах з'яўляецца павышэнне ўраджайнасці збожжавых культур і падрыхтоўка сенабабовых культур для свіней. Гэтае сена не толькі замяняе частку канцэнтраваных кармоў у рацыёне, але з'яўляецца таксама і вітамінным дадаткам у корм, што асабліва важна ў зімовы час.

Практыка паказала, што пры кармленні парасят-ад'ёмышаў можна без усякай страты для іх развіцця карміць 20 проц. канцэнтраваных кормаў замяняць мешанкай мукі з сенам вікі-аўса.

Асаблівую ўвагу павінны звярнуць свінасоўгасы пры стварэнні кармавой базы на забеспячэнне свіней неабходнымі для іх сакавітымі кармамі. Навуковыя доследы і гаспадарчая практыка за апошнія гады паказалі, што сілас бабовых культур з'яўляецца каштоўным кормам для ўсіх катэгорый свіней. Гэты сілас мае вялікае значэнне ў справе выпрацоўкі здаровага маладняка, забеспячэння свінога стада сакавітымі кармамі на працягу ўсяго года. Аднак большасць першых соўгасаў яшчэ не ўсвядомілі вялізарнага значэння сіласа і сенажу бабовых культур у свінагадоўлі.

Народкі выпадкі дрэннага выгадоўвання выпасаў для свіней, калёка не ва ўсіх соўгасах арганізаваны зялёны канвеер і т. д. І соўгасаў не вядзе ніякай работы па рашучаму паляпшэнню лугавых арганізацый штучных выпасаў, асабліва—рашучага рэзкага паляпшэння ўраджайнасці сваіх палёў.

Выключна важным з'яўляецца пытанне паляпшэння лугоў соўгасаў, арганізацыі палепшаных выпас

ТАВ. ТРАЯНОЎСКІ ПРЫБЫЎ У ВАШЫНГТОН

ВАШЫНГТОН, 7 студзеня (БЕЛТА).

ПРЫБЫЎ ПАЎНАМОЧНЫ ПРАДСТАЎНІК СССР У ПАЗІ Т. ТРАЯНОЎСКІ, ЯГО ВІТАЛІ НА ВАКЗАЛЕ ПРАДСТАЎНІКІ МІНІСТЭРСТВА ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ.

Заява т. Траяноўскага па радыё

НЬЮ-ІОРК, 7 СТУДЗЕНЯ (БЕЛТА).

ПАЎНАМОЧНЫ ПРАДСТАЎНІК СССР Т. ТРАЯНОЎСКІ ПА ПРЫБЫЦІ Ў ПАЗІ ЗРАБІЎ ПРАДСТАЎНІКАМ ДРУКУ НАСТУПНУЮ ЗАЯВУ, ЯКАЯ ПА РАДЫЁ БЫЛА ПЕРАДАНА ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ:

«Я ТОЛЬКІ ШТО ПЕРАЕХАЎ АТЛАНТЫЧНЫ АКІЯН. ЯКАЯ АДЛЕГЛАСЦЬ АД СОВЕЦКАГА САЮЗА! НЕ ТАК ДАЎНО Я МОГ НАГЛЯДАЦЬ ЦІХІ АКІЯН, ЯКІ АДДЗЯЛЯЕ СОВЕЦКІ САЮЗ АД ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАЎ НА ДРУГІМ БАКУ ЗЯМНОГА ШАРА. ДВА АКІЯНЫ АДДЗЯЛЯЮЦЬ НАШЫ ВЯЛІКІЯ КРАІНЫ. АДДЗЯЛЯЮЦЬ, АЛЕ Ў ТОЙ ЖА ЧАС ЗЛУЧАЮЦЬ НАС. МЫ АБ'ЯДНАНЫ НЕ ТОЛЬКІ ГЭТЫМІ ЗРУЧНЫМІ ШЛЯХАМІ ЗНОСІН. КАЛІ ВЕРНА, ШТО МЫ ЎСТУПАЕМ У ЦЯПЕРАШНІ ЧАС У ПІХААКІЯНСКІ ПЕРЫЯД СУСОВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ, ДЫК ТАКСАМА ВЕРНА, ШТО АТЛАНТЫЧНАЯ ЭРА ЯШЧЭ НЕ ЗАВЕРШАНА. ВАКОЛ АБОДВУХ АКІЯНАЎ РАЗГОРТВАЮЦЦА ВЕЛЬМІ ВАЖНЫЯ ПАДЗЕІ. АБЕДЗВЕ НАШЫ КРАІНЫ МОЦНА ЗАЦІКАЎЛЕНЫ ВА ЎСІМ ТЫМ, ШТО АДБЫВАЕЦЦА НА ШЫРОКІХ УЗБЯРЭЖЖАХ АТЛАНТЫЧНАГА І ЦІХАГА АКІЯНАЎ І МОРАЎ, РАЗМЕЖЧАНЫХ КАЛЯ ГЭТЫХ АКІЯНАЎ. У СУЧАСНЫ МОМАНТ НАС ЗВЯЗВАЮЦЬ МНОГІЯ АГУЛЬНЫЯ ПАЧУЦЦІ І АГУЛЬНЫЯ МЭТЫ. МЫ ПАВІННЫ ЗЛУЧЫЦЬ НАШЫ РУКІ І ПРАЦАВАЦЬ РАЗАМ, КАВ ДАСЯГНУЦЬ ГЭТЫХ МЭТАЎ ДЛЯ ВЫГОДЫ НАШЫХ НАРОДАЎ І ПРАЦВІТАННЯ ЎСЯГО ЧАЛАВЕЦТВА».

МІНІСТР БЕК АБ ПОЛЬСКА-СОВЕЦКІХ АДНОСІНАХ

ПАРЫЖ, 7 студзеня. (БЕЛТА).

«Эксцельсіор» апублікавала інтэрв'ю з польским міністрам замежных спраў Бекам Заканчаючы польска-совецкія адносіны, у прыватнасці, у сувязі з выступленнем Літвінава на сесіі ЦВК. Бек заявіў:

«Неаднаразова адказ на гэту прамову праз некалькі дзён у сенаце. Бо побачаю падкрэсліць думку Літвінава па гэтаму пытанню. Думаю, што польска-совецкае зближэнне прадаўжае ўзор пошукаў новых шляхоў, якія замест блукання сярод дробных затрудненняў, накіраваны да дасягнення станоўчых рэзультатаў.

Нашы адносіны з Совецкім Саюзам развіваюцца лагічнымі этапамі, з якіх кожны адзначан дэкларацыяй і палітычным дакументам. Мы падпісалі ў мінулым годзе цэлую серыю падобных актаў, з якіх кожны з'яўляўся рэзультатам эволюцыі, якая адбываецца ў поўнай адпаведнасці з развіццём адносін, а таксама з дзеяннямі абодвух урадаў. Гэтыя дзеянні далоць мне вялікае задавальненне. Лічу іх матутным фактарам стабілізацыі становішча ва Усходняй Эўропе. Мы шукаліся, што знайшлі новыя шляхі, па якіх метадычна ідзем наперад».

СКАНДАЛЬНАЯ ФІНАНСАВАЯ АФЕРА ВА ФРАНЦЫІ

ШОТАН НАМЕРАН ЗАЯВІЦЬ АБ АДСТАЎЦЫ ЎСЯГО ГАБІНЕТА

ПАРЫЖ, 7 студзеня. (БЕЛТА).

Аферыст Ставіцкі, сын пускага, які натуралізаваўся ва Францыі да вайны, палягала ў машынаістве з Байонскім муніцыпальным ламбардам.

Праз выпуск фальшывых бон ламбарда Ставіцкаму ўдалося прысвоіць каля паўмільёна франкаў. Яго саўдзельнік дырэктар ламбарда быў арыштаваны. Даведаўшыся аб гэтым, Ставіцкі ўцёк.

Рад газет спасцярігае, што Ставіцкага не знойдуць з прычыны яго сувязей з палітыкай і палітыкамі. Бо дучы агентам аховы Ставіцкі шырока карыстаўся адпаведнымі пасведчаннямі і ў сваіх шматлікіх аферах заўсёды аставаўся беспакаранным. Між іншым, кіраваў некалькімі акцыянернымі таварыствамі, арганізаваў аўтаномную касу грамадскіх работ, на чале якой знаходзіўся былы пасол Францыі ў Ватыкане Фантэне.

Апошняй аферай Ставіцкага, ад якой асабліва пацярпелі дробныя рантъе, закупіўшы фальшывых бон на велізарную суму, скампраметавана некалькі дэпутатаў, муніцыпальных саветнікаў, а таксама прад стаўнікоў судовых улад, не даваўшых ходу справам аб ранейшых машынаістках Ставіцкага. Зроблен вобыск на кватэры, а таксама ў бюро рэдактара «Волонтэ» Дэкобары, пакараванага ў сувязях са Ставіцкім.

Згодна паведамленням «Матэн», прэм'ер Шотан прапанаваў міністру калоній Далім'е, рэкамендаваўшаму страхавым таварыствам набываць боны Байонскага ламбарда, падаць у адстаўку. Далім'е адмовіўся. Вось чаму Шотан намеран 8-га студзеня заявіць аб адстаўцы ўсяго габінета.

МІЖНАРОДНАЯ ХРОНІКА

* Паволле слоў «Дэйлі мейль», граф. Халдэйн і Дэвіс вынайшлі апарат для дыхання, які дае магчымасць падымацца ў стратасферу, не зварачаючыся да герметычна закрытых гандол.

* У сувязі з галадоўкай Рузгаў міжнародны камітэт барацьбы супроць вайны і фашызма адправіў кітайскаму пасольству ў Парыжы тэлеграму з пратестам супроць тэрэнпага рэжыму, якому падпадаюць Рузгаі, і з патрабаваннем неадкладнага вызнаення іх.

* У Калэ адбылася дэманстрацыя 4-х тысяч беспрацоўных докераў, патрабаўшых бясплатнага размеркавання вугалю сярод беспрацоўных докераў. У сутычцы з паліцыяй 7 паліцэйскіх паранены.

ЯПОНСКІЯ ПЛАНЫ ЗАХВАТА МАНГОЛІІ

ШАНХАЙ, 7 студзеня. (БЕЛТА).

Паведамленні аб маючай быць рэстаўрацыі манчжурскай манархіі вызываюць вялікі непакой кітайскай грамадскасці.

«Чайна прэс» звязвае гэта з так званым аўтанамісцкім рухам ва ўнутранай Манголіі, які пачаўся некалькі месяцаў назад і за спіной якога стаяць японскія агенты.

«Папярэдне граніц Манчжоу-Го і ХАРБІНСКІЯ БЕЛАБАНДЫТЫ

ШАНХАЙ, 7 студзеня. (БЕЛТА).

Каментуючы забойства французскага падданага Касцэ ў Харбіне, «Піпло трыбюн» падкрэслівае, што ўдзельнікі банды, захапіўшай і забіўшай Касцэ, не толькі былі звязаны з рускімі белагвардзейцамі «патрыятычнымі арганізацыямі», але нават займалі кіруючыя пасты ў гэтых арганізацыях і адначасова працавалі ў Манчжурскай паліцыі, прычым японцы скарыстоўвалі іх у якасці сваіх агентаў. Толькі пасля рашучага патрабавання французскага консульства, накіраванага непасрэдна японскай ваеннай місіі, забойцы былі выдалены.

«Вельмі паказальна,—піша «Піпло трыбюн», — што крымінальныя элементы карысталіся такой сілай ва ўмовах японскага рэжыма».

«Піпло трыбюн» звяртае ўвагу на тое, што, згодна заявы японскага жандарскага афіцэра Накамура, адзін з актыўных удзельнікаў гэтай банды Мартынаў у 1932 годзе вазіў зброю ў Ізінані (правінцыя Шандунь) кулямёты і амуніцыю для атрадаў белых генералаў.

СТАНОВІШЧА СІНЦЗЯНСКАГА ПРАВІНЦЫЯЛЬНАГА УРАДА

АЛМА-АТА, 7 студзеня. (БЕЛТА).

У рэзультаце паспяховага прасоўвання на Кульджу атрадаў урадавых войск і беспаспяховага ўнутры часцей генерала Чжана, падняты ім мяцеж супроць сінцзянскага правінцыяльнага ўрада ліквідаваны.

Асноўныя сілы генерала Чжана, заняўшы аб сваім падпарадкаванні правінцыяльнаму ўраду, адаліся камандаванню ўрадавых войск. Генерал Чжан з невялікай групай сваіх прыхільнікаў уцёк у горы.

Грамадзянскі губернатар Кульджы жыпскай акругі Ван Чжы-цзо па тэлеграфу паведаміў Урумчынскаму ўраду аб ліквідацыі мяцежа і прыняцці ім мер па аднаўленню спакою ў акрузе.

Прадстаўнікі насельніцтва акругі таксама звярнуліся да правінцыяльнага ўрада з заявай, у якой выказваюць задавальненне выгнаннем з Ілійскай акругі мяцежніка Чжана, які з-за сваіх ганарлівых планаў трымаў вялікае войска, чыніў усялякія незаконныя паборы, прыгнятаў насельніцтва, разбураў мясцовую гаспадарку і газдаль.

Насельніцтва просіць правінцыяльны ўрад абмежаваць уладу ваеннага начальніка акругі і скарачыць колькасць утрымліваемых там войск з тым, каб аблегчыць становішча насельніцтва.

УЗБРАЕННІ ГЕРМАНІІ

ВЕНА, 7 студзеня. (БЕЛТА).

Як паведамляе «Арбейтэр цайтунг», Германія ліхаманачна рыхтуецца да паветранай вайны, будуе велізарны паветраны флот, навучае тысячы лётчыкаў і разгортвае шайпырэйшую прапаганду паветранай абароны сярод насельніцтва.

АРГАНІЗАЦЫЯНА ЎСЕ ПАДРЫХТАВАНА. У радзе месц пабудаваны падземныя аэрадромы, добра ахаваныя ад дзеяння бомб. У прыватнасці, такі аэрадром пабудаваны каля Даммціна ў Памеранніі. Увесь раён аэрадрома агароджан калючым дротам і ахоўваецца салдатамі рэйхсвера. Пад зямлёй будуюцца бетанаваныя ангары. Самалёты робяць пасадку над бетанаваным полем і знікаюць у падземным аэрадроме.

ЛАГЕР СМЕРЦІ

СТАНОВІШЧА ПАЛІТЗНЯВОЛЕНЫХ У ДАХАУ

ЛОНДАН, 7 студзеня. (БЕЛТА).

«Манчэстэр гардыен» паведамляе, што ў баварскім канцлагеры Дахау у 10 бараках да 2 з паловай тысяч зняволеных, агромадная большасць якіх — комуністычныя рабочыя.

Комуністычныя актывісты, якія адмаўляюцца даваць вескі следчым, кінуты ў сырыя, цёмныя і нешапляемыя карцары. Арыштаваныя прыкованы ланцугамі да сцяны. Ложкам ім служаць непрыкрытыя драўляныя дошкі.

Зняволеных б'юць пераплеценым дротам, вазовай жыламі, якія яны самі павінны згатаўляць. Іх б'юць таксама мокрымі рушнікамі, каб не было відаць рубцоў. Лютасць цюремшчыкаў даходзіла да таго, што яны палілі зняволеных запаленымі папяросамі. Толькі за апошні час замучана 50 зняволеных.

ПАВЕДАМЛЕННІ

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 10, 11, 12 і 13 студзеня г.г., а 10-й гадзіне раніцы ў г. Віцебску адбудзецца пасяджэнне Рэспубліканскай камісіі па разгляду апеляцый на рашэнні Віцебскай, Сіроцінскай, Полацкай, Дрысенскай, Лёзненскай, Бешанковіцкай, Суражскай, Гарадоцкай, Расонскай і Асвейскай раённых камісій, наступных таварышоў:

10-га студзеня — у г. ВІЦЕБСКУ:

Соракалетаў Ф. В., Назараў В. М., Капышэў Е. Ф., Альшынскі П. І., Граф А. Я., Левіцкі П. І., Балванёнка Е. С., Ганін І. В., Альшэўскі П. І., Пічульскі С. М., Вахцераў Г. А., Салаўёў Н. С., Славін Ю. А., Шэйнкін І. Л., Зільбер Б.Я., Мускат Б. М., Шульчэнка А. М., Змышко А. М., Ронкін А. А., Баброў З. Ф., Аёол І. Ю., Дамброўскі А. С., Фрыд І. М., Купкін К. І., Яшкін Т. К., Лейзерын С. Б., Кардашэнка М. С., Маўшовіч Ш. А., Кулініч А. В., Банькоўскі С. І., Васільеў І. Т., Лібін А. Х., Трухаваў В. К., Несцераў С. І., Мацьеў І. І., Лахін І. Л., Гарэлік Р. М., Будакімаў І. Е., Блеч Б. Н., Усцінаў І. Г., Украінцаў І. С., Рабчык Е. С., Васілеўскі Т. Д., Казакоў С. Я., Песін Я. Е., Сінельнікаў Г. І., Шапіра Ф. Н., Сталіна Г. Я., Гатаўскі І. Н., Колатаў М. Ф., Назараў Т. В., Калугін Ю. К. (Віцебскі раён).

11-га студзеня — у ВІЦЕБСКУ:

Зенчэнка В. І., Багдалаў А. С., Медведзкін М. Е., Гецкер Г. Р., Рудчэнка Е. П., Шэўцоў І. П., Ходасаў Н. І., Емельянаў Е. Е., Шылаў А. Н., Скобаў І. М., Баранікоў В. А., Дрэпцяроў Т. І., Захараў І. З., Паўлаў М. П., Міроненка В. Д., Якаўлеў А. А., Маскалёў В. С., Шыхаваў К. Ф., Шахноўскі Д. В., Чарноў П. Р., Скабоў С. П., Шумейка Е. М., Пальчінскі В. І., Місуноў А. Л., Басенка І. Е. (Сіроцінскі раён).

Бачкалоў І. А., Барсукоў Л. Ф., Пілецкі В. І., Пірог І. Е., Казінгін А. Н., Бамуцін І. М., Сенчанка П. А., Дамброўскі Т. Н., Камінскі Я. І., Пноэс А. М. (Полацкі раён).

Бурэц А. Ф., Ашурак Э. Л., Мелешка Ф. І., Гольман М. А., Арлоўскі С. І., Бучачонак А. І., Тіханава О. Ф., Ластаўка С. Н., Шкляр М. Р., Метлюк І. І., Жук І. І., Усцінавіч А. Ф., Жук М. А., Вайнавіч М. А., Валенцінонак І. К., Грачкін А. І., Клеўчынскі Е. Н., Бульгін Ф. Т. (Дрысенскі раён).

12-га студзеня — у г. ВІЦЕБСКУ:

Менжынскі М. І., Кофтаў В. Т., Драздоў Д. Н., Варкоўскі Ф. П., Шышкаў П. Г., Дзепкоў М. Н., Шарстнёў В. В., Загвоздаў І. П., Бітный-Шляхта В. А., Лебедзеў А. К., Калатоўкін Т. К., Тереншцеў К. Л., Новікаў М. Е., Пасрэднікаў П. Ф., Сапін С. Л., Шулікаў П. К., Каралькоў А. А., Клімчэнка М. О., Барашаў П. І., Мінавіч А. Т., Паўленка Е. І., Барысёнак М. В., Шатарэнік З. Т., Емельянкін П. К., Смолаў Д. С., Гешіна М. Л. (Лёзненскі раён).

Матора С. А., Сопат А. Н., Копышаў Д. О., Пялякоў Ф. І., Балмутнін П. С., Лапагін Е. Н., Лейзанка П. Х., Хітрыкаў Ф. А., Гаранін І. А., Платінскі І. М., Мачэнят В. Л., Корзун А. Д. (Бешанковіцкі раён).

Голуб'єў А. Н., Чэрнігін Ф. Е., Опірыдонаў І. А., Патоцкая А. Е., Платонаў Н. В., Вальтар Ю. І., Чэрнышоў І. А., Смольскі М. І., Брасікін Х. А., Анцуфрыеў К. П., Вертушка В. М., Зенцзераў В. Ф., Дземідаў П. П., Лесніка І. Г., Калуоцін Х. П., Гулеў Н. І., Калаленка Г. І., Сеніра М. К., Зігмундовіч Э. Ф. (Суражскі раён).

13-га студзеня — у г. ВІЦЕБСКУ:

Захараў Т. А., Масюкін Г. Л., Сту ахтаў П. Т., Ісакаў С. Ф., Пінчукаў В. В., Кардо А. М., Тэва Ф. І., Крашка С. А., Міхайлаў Т. Д., Клімента А. С., Чарняўскі М. Я., Плітаў І. С., Пракоф'єў А. А., Доўтапольскі С. А., Скавародкін А. П., Петрусь М. Е., Степанцоў І. А., Жолнероўскі В. Е., Клімаваў В. Д., Шмяцеў А. Е., Барсукоў В. П., Майсеў Е. І., Тымчонах С. Я., Бярэнікоў С., Галушчэнка І. С., Ляпота Ф. Я., Кажухоў А. Т., Раманаў С. Р., Шыроцкі Ф. К., Тетеркін Д. Л., Нікіфараў П. Н., Буткоў П. К., Ніканаў В. Н., Ніканаў І. Н., Кажуноў Ф. П., Усава П. А., Мароз А. К., Дзвонісаў С. Д., Сіначоў В. С. (Гарадоцкі раён).

Бурахоў П. Ф., Бурнасотка А. Ф., Мякінін Н. В., Бурахоў А. Н., Чапайкоўскі П. П. (Расонскі раён).

Новікаў С. К. (Асвейскі раён).

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

***

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б паведамляе, што 12, 13, 14 і 15 студзеня г. г. у г. СЛУЦКУ будзе працаваць рэспубліканская камісія па чыстцы па разбору апеляцый на рашэнні слуцкай, стара-даворскай, старобінскай, чырвонаслабодскай, любаньскай і капыльскай райкамісій наступных таварышоў:

НА 12 СТУДЗЕНЯ:

Кулыбо П. І., Чапулянец К. Ф., Проэнт І. Б., Монлаль Б. Р., Пупейко Н. В., Высоцкі М. А., Ахрамчык А. А., Дымоў І. І., Маёр Б. Б., Дашко А. Л., Мінін М. В., Шостак Ф. Д., Скавчэўскі К. А., Бугаравіч В. В., Ахрамовіч В. М., Карако Г. К., Лемеш Н. Т., Сідочаў М. А., Брыль А. Ф., Гарэлік Б. Б., Калальскі Б. Г., Кецко В. В., Басальга Д. Б., Рэйко І. А., Іваўцэін І. В., Маліўскі М. В., Замосткін А. М., Хоменко П. Т., Матуо Н. Н., Кулешаў С. С., Дарасінская Г. Х., Фрэйтак О. Ф., Кувыкіна Е. А., Лукашэвіч І. А., Насенкоў І. П., Сушэвіцкі І. Л., Юзвік К. А.

НА 13 СТУДЗЕНЯ:

Адрыгалаў Т. А., Новахацкі Д. С., Красікоў В. А., Рычалоўскі С. А. (Старыя дарогі).

Аганьеў Г. М. Скрыгчая В. К., Берэзоўскі В. М., Галоцік П. С., Пілічук М. І., Баркоўскі І. І., Зенеевіч І. І., Каротка М. К., Салагуб І. Ф., Зеньковіч Э. А., Макаравіч А. І. (Капыль);

Петрусевіч Д. С., Лабуноў П. М., Полоцік П. В., Шнек М. М., Лукашэвіч В. А., Прым М. І., Вакуленко Т. Т., Закроўскі А. Ф., Каралецкі М. І., Доўгалевец Ф. Н., Навіцкі В. Д., Нікалаеў Ф. Ф., Капрык П. П., Кандрацьеў І. К., Гарбаленя Г. Н., Драбатовіч В. Т., Броўка Д. Т., Шафрановіч Н. Д., Чэрвагубаўскі Р. Е., Жаўнаровіч Е. П., Касіорыч В. І. (Чырвоная Слабада).

НА 14 СТУДЗЕНЯ:

Ліхалат Ф. М., Міхайлаў М. Д., Курапі Н. Д., Філіп Н. С., Пяўко І. А., Гурскі П. Н., Мінейка Ф. Д., Бачуркоў Г. І., Сівак Н. С., Рамешчык Д. В., Ізох І. З., Гарбуз І. Г., Нікі К. П., Брайнец Я. Е., Дзерскі І. І., Каваўоўскі Я. С., Сільковіч А. К., Гольдзін Н. З., Стапкевіч В. С., Мышкоўскі С. Н., Бародзіч І. І., Вішнеўскі П. І., Гапчароў Л. П., Гапчароў М. М., Анісімаў Т. Д., Сквіцкі Я. П. (Любань).

НА 15 СТУДЗЕНЯ:

Рыжыкаў М. Г., Бораячык С. Х., Бацкевіч П. С., Папоў М. Т., Мышалаў М. В., Семак Г. В., Ламейка С. П., Казлоў В. А., Прынковіч Б. Ф., Грынюк І. С., Сакалоўскі П. А., Дзеравянка І. Д., Холяд Г. Ф., Азаранік І. М., Кухта І. А., Барбахоўскі Л. І., Прахоценка А. К., Шаўчэнка М. Т., Сыс Н. М., Юрэтскі Ф. І., Пустазітаў П. Н., Мурашка Д. К., Пракаповіч П. С., Лефлаўскі З. П., Велікода А. М. (Старобін).

АРГКАМІСІЯ ПАВЕДАМЛЯЕ, што мандаты на 3-ю мінскую гарадскую партканферэнцыю будуць выдаваць у ГК КП(б)Б, (пакой № 54) 9-га, 10-га і 11-га студзеня, з 10 г. раніцы да 4-х вечара, і ў Доме камсамольцы (пакой № 12) 10-га студзеня з 5 да 9 г. веч.

Мандаты будуць выдавацца толькі па прадстаўленні ўсіх патрэбных спісаў па дводзных формах на дэлегатаў.

Тэлефон ГК — аргкамісіі—21-116.

Аргкамісія.

ПАПРАЎКА

У «Звяздзе» (№6) у заметцы «У Саўнаркоме БССР» украдзена памылка. У трэцім абзацы трэба чытаць: «...арыентуючыся на адход ад ліквідацыі індывідуальных гаспадарстваў і разміры ад адной восьмай да адной чацвертай га на рабочую сям'ю».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Па БССР

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ФІЗІКА-МАТЭМАТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У Менску адбылася ўсебеларуская фізіка-матэматычная канферэнцыя, скліканая Акадэміяй Навук і дзержаўным універсітэтам.

У работах канферэнцыі прымалі ўдзел каля 100 прадстаўнікоў ад Беларускай Акадэміі Навук, ВНУ, ВТНУ і тэхнікумаў.

Былі заслуханы 20 навуковых дакладаў. Асаблівы інтарэс выклікалі даклады на тэму «Ленін і крызіс прыгрэзлазнаўства ў капіталістычных краінах», «Характэрныя рысы сучаснага становішча фізікі», «Маркс, Энгельс і Ленін аб матэматыцы», «Аб фотаэлектрычнасці», «Аб электрыфікацыі», «Аб структурным аналізе» і т. д.

ВЫПУСК КАМАНДЗІРАЎ СОЎГАСНАЙ ВЫТВОРЧАСЦІ

Сёння ў Курасоўгастыне адбудзец па выпуск трохмесячных курсаў на падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы дырэктароў соўгасаў, загадчыкаў участкамі і фермамі Наркамата соўгасаў БССР. На курсах навучаліся 40 работнікаў сістэмы Наркамата соўгасаў і 8 — Наркамзема.

У ФОНД ІМЯ XVII З'ЕЗДА ВКП(б)

На фабрыках і заводах БССР разгарнуўся збор рацыяналізатарскіх прапаноў і вынаходніцтваў у фонд XVII з'езда ВКП(б).

У Менску на гарбарні «Большэвік» па гэтых дзнях адбыліся сцёты вынаходнікаў і рацыяналізатараў. Заключаны соцдагаворы паміж ячэйкамі і пазасобнымі вынаходнікамі. За снежань паступіла 102 рацыяналізатарскія прапановы.

На заводзе імя Варашылава паступіла 107 прапаноў. Частка з іх ужо рэалізуецца.

У паход уключыліся і прадпрыемствы Гомеля. Па ініцыятыве гарадзкога совета вынаходнікаў адбыўся злёт вынаходнікаў Гомеля, дзе далегаты прынялі на сябе абавязацельства даць у фонд з'езда партыі 2.000 прапаноў. На 1-е студзеня паступіла ўжо 1200 прапаноў.

На заводзе сабрана 50 каштоўных вынаходніцтваў і прапаноў, рэалізацыя якіх на прыблізных падліках дасць каля 300 тыс. руб. эканоміі.

У Віцебску абвешчан конкурс на лепшую ячэйку г-ва вынаходнікаў па падрыхтоўцы да XVII з'езда. Асабліва пасьпяхова конкурс праходзіць па гарбарні, дзе рабочыя ўнеслі 10 каштоўных прапаноў.

На шпейнай фабрыцы «Спар індустрыялізацыі» за 2 дні пасля злёта вынаходнікаў і ўключэння ў паход у фонд імя XVII з'езда партыі паступіла 19 прапаноў з эканамічнай эфектыўнасцю ў 13 тыс. руб.

Масавая работа разгорнута на шаўковай фабрыцы імя Куйбышава ў Магілеве. На 1-е студзеня тут паступіла 120 прапаноў, якія даюць эканоміі 130 тыс. руб.

КОНКУРС НА ЛЕПШЫ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ТВОР ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

10-га студзеня канчаецца конкурс, абвешчаны Наркамаветы, ЦКПОБ, ЦК ЛКСМБ і ДВБ на лепшы літаратурна-мастацкі і навукова-папулярны твор для дзяцей. У журы конкурса паступіла каля 20 твораў, з якіх 9 на мовах нацыянальнасцей.

Тэматыка твораў — інтэрнацыянальнае выхаванне дзяцей, Беларорбуд, калгаснае будаўніцтва, школы, удзел піянераў у агуле сацыялістычнага ўраджаю, транспарт і т. д.

ДВОЙЧЫ НАРОДЖАНЫ

КІНО-ТЭАТР ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА — Совецкі мастацкі фільм СПРАВА ТАРАСА ШАЛАВАДЗЕ. У фае—Канцэртнае адзяньне.

Пролетарый — Мастацкі кіно-роман УКРАЗІЯ (БЯГЛЕЦ). Каса—з 4 г. 1-я серыя ў 10 частках.

КІНО СПАРТАК — Сёння выдатны фільм ДЗЕВЯТАЕ СТУДЗЕНЯ. Драма ў 10 частках.

ДЗІЦЯЧЫ-ГУЛЯНЫ КІНО-ТЭАТР — Сёння мастацкі фільм ЮДА у 6 частках. У праграме гукавая хроніка.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНА". Ад 9 студзеня совецкі мастацкі фільм ДЗЯЎЧЫНА З ПАЛУБЫ. У праграме хроніка Свюскіно „ЗВЯНО ПЕРАМОГІ".

Наркамзем ЗАПРАШАЕ для працы ў Моцілаўскі Вучотна-фінансавы тэхнікум наступных ВЫКЛАДЧЫКАЎ

1. Па асновам балансавага ўліку і рахункаводству прамфінплана, крэдытаванню і фінансаванню калгасаў МТС. Нагрузка . . . 800 гадзін.
2. Асновы с-г статыстыкі і агульнай, калгаснае рахункаводства і справаздачнасць. Нагрузка . . . 1000 гадз.
3. Арганізацыя працы ў калгасах і размеркаванне даходу, складанне прам фінплана, арганізаванні . . . Нагрузка . . . 700 „
За дакладнай зварачацца ў сектар кадраў НКЗБ, Дом Урада, пакой № 150-151.
Наркамзем.

ДОМ КОМАСВЕТЫ ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО з 7-і—34 г. часова спыняецца праца навуковай чытальні Дома Комасветы, а ўся астатняя праца—кансультацыйная, ву чэбная, бібліятэка, а таксама канцылярыя—будуць вытвярацца на першым паверсе—пакоі № 13 і 14 (Уваход з вул. Энгельса).

МЕНРАЙБАЗА „ТОРГСІН" даводзіць да ведама насельніцтва, што пачалася скупка БРЫЛІАНТАЎ І АЛМАЗАЎ, якія будуць аплачвацца купюрамі ТОРГСІНА. Скупка будзе праводзіцца ў Цэнтральным Універмагу. Менск, рог Ленінскай і Совецкай. АДМІНІСТРАЦЫЯ.

Беларускі навукова-даследчы гідра-метэаралагічны інстытут АБВЯШЧАЕ КОНКУРС на замяшчэнне наступных вакансій да геафізічнай абсерваторыі і інстытуту:
1. Заг. аддзелам акцінаметрыі (праф. або дацэнт);
2. Заг. аддз. атмасферна-электычным (праф. або дац.)
3. Заг. аддз. аэрологіі (праф. або дацэнт).
4. Заг. аддз. агульнай і эксперыментальнай метэаралогіі (праф. або дац.)
5. Навуковых работнікаў і асістэнты па акцінаметрыі, атмасферным электрыцы і эксперыментальнай метэаралогіі па і навук работ. 1-га разр. і па і асістэнту той-жа спецыяльнасці.
6. Кіраўніка сектара гідралогіі (прафесар).
7. Асістэнт па гідралогіі і метэаралогіі па і работы.
Ад кандыдатаў патрабуецца: навуковасць стажа па спецыяльнасці, навуковых прац і вопытаў партыйных, совецкіх і прафесіянальных арганізацый.
Для прафесароў і дацэнтаў умовы па ўгоде, з забеспячэннем кватэрай. Навуковыя работнікі і асістэнты кватэрай забяспечваюцца ў агульным парадку.
Аклады для асістэнтаў ад 200 да 225 р., для навуковых работнікаў—ад 275 да 400 р.
Заявы, кароткія жыццяпісы і спісы навуковых прац накіраваць па адрасу: Менск, Шырокая 28, Гідраметінстытут БССР.
Дырэктар ПМЕІНА—КАНАВАЛАЎ
Дырэктар Геафізічнай абсерваторыі праф. КАЛІГАРОДАЎ.

Марына-Горскі садова-гародны тэхнікум АБВЯШЧАЕ СТУДЗЕНЬСКІ НАБОР студэнтаў на першыя курсы садовага і гародняга аддзялення.
У тэхнікум прымаюцца асобы, скончыўшыя сямігодку, ці маючыя асвету не ніжэй сямігодкі.
Заявы прымаюцца да 25 студзеня Іспытаніі з 26 студзеня. Пачатак заняткаў з 1 лютага.
Да заявы неабходна дакладаці дакументы, згодна даведніка НКА.
Прынятым у лік студэнтаў забяспечваюцца поўнасцю інтэрнатам і стыпендыяй па паспяховасці.
Пры тэхнікуме ёсць свая сталовая, баня і пральня. Тэхнікум знаходзіцца пры ст. Пухавічы.
Заявы накіроўваць па адрасу: Марына-Горкі, Пухавіцкага р-на с.-г. тэхнікум.
Дырэкцыя.

БУРЭННЕ артэзіянскіх СТУДНЯЎ са сваімі матэрыяламі прымае на сябе аддзяленне ўсесаюзнага дзяржаўнага буравога трэста па БССР, Заходняй вобласці і Украіне. З заказамі зварачацца: г. Гомель БССР, вул. Леніна, 18 „БУРВОДТРЭСТ".

Сектар па замежных справах ЦК т-ва ЧЫРВОНАГА КРЫЖА БССР РАСШУКВАЕ родзічаў ніжэй пералічаных асоб, якім належыць атрымаць спадчыну і розныя віды грашовых узнагарод. ПАШУКАЙ СВАЙГО РОДЗІЧА Ў ГЭТЫМ СПІСУ*)

Калі ты яго знойдзеш пішы аб гэтым зараз-жа ў ЦК т-ва Чырвонага Крыжа БССР—замежны сектар г. Менск, Першамайская, 7.
УВАГА: трэба мець на ўвазе, што прозвішчы і імёны ірм перакладзе з англійскай на рускую мову могуць быць перабалтанымі.

ГЕСПЕР Міхаіл. ГЕТМАН Георгій. ГІПСОН Генрых. ГІЛІТ Марцін. ГЕЛЬФМАН Калман. ГІНДЗІН Вільям. ГІНЗБУРГ Рэйман. ГІНЗБУРГ Вільгельм. ГІНЗБУРГ Давід. ГІРЭЛЬ Якаў. ГІТЭС Георгій. ГІРШ Самуіл. ГІС Іван. ГЛАЗЕР Лаўрэнці. ГЛАЗАЎ Ісак. ГЛАДШТЭЙН Аба. ГЛАДШТЭЙН Самуіл. ГЛАРКМАН Генрых. ГЛАСС Абрам. ГЛАССЕР Роберт. ГЛАСШОЎ Карл. ГЛАШОЎ Іосіф. ГЛІКМАН Якаў. ГЛУЗМАН Марыс. ГЛУКОЎСКІ Іосіф. ГЛУМТ Вільгельм. ГЛЯНСКІ Якаў. ГНЕСІН Якаў. ГОГАЛАШВІЛІ Давід. ГОГІН Самуіл. ГОДАСКІ Антоній. ГАДОМСКІ Іосіф. ГОЛАП Генры. ГОЛЬД Марыс. ГОЛЬД Якаў. ГОЛЬДБЛАТ Густаў. ГОЛЬБЕРГ Моррыс. ГОЛЬДЗАНД Натан. ГОЛЬДЗАНД Ісідар. ГОЛЬБЕРГ Хайман. ГОЛЬДМАН Вільям. ГОЛЬДМАН Давід. ГОЛЬБРАЙХ Самуіл. ГОЛЬДМАН Іосіф. ГОЛЬДШТАЎБ Хайман. ГОЛЬДШТЭЙН Ісаак. ГОЛЬБЕРГ Веніямін. ГОЛЬД Людвіг. ГОЛЬДБЕРГ Філіп. ГОЛЬДЗЕН Георгій. ГОЛЬДОН Альберт. ГОЛЬБЕРГ Лео. ГОЛЬДМАН Хайман. ГОЛЬМАФ Саламон. ГОЛЬСІН Джон. ГОЛЬДФЕЙН Самуіл. ГОЛЬФЕЛЬД Георгій. ГОРКО Фёдар. ГОМБЕРГ Арнольд. ГОМІНСКІ Веніямін. ГОНЧАРУК Нікалай. ГОНКРЭЙ Альбіон. ГОРВІЦ Гарры. ГАРДОН Мэск. ГОРЭНСКІ Веніямін. ГОРЫН Аўрам. ГОРЫН Людвіг. ГОРБЕРГ Самуіл. ГОРБАЧ Сідар. ГАРДЗЕЙЧУК Антон. ГОРКА Фёдар. ГОРНІЦ Нікалай. ГОРМАН Ісідар. ГОРБЕРГ Натан. ГОРВІЦ Натан. ГОРФЕЙН Макс. ГАРАЧКА Вікцтар. ГОСЦІНГ Карнелій. ГОТЛІБ Абрам. ГОТ Іосіф. ГОФМАН Адольф. ГОФМАН Гарры. ГОФЕР Якаў. ГРАБЕР Густаў. ГРАБОЎСКІ Роберт. ГРАБЕЙ Сцяпан. ГРАБ